

Чым небяспечнае сонца?

СТАР. 2



Колькі каштуюць розныя канікулы беларусам?

СТАР. 3



Мары лётчыка і літаратара

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ліпеня 2014 г. СУБОТА № 134 (27744) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СУМЛЕННА І СПРАВЯДЛІВА

### павінна размяркоўвацца арэнднае жыллё

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе аб прапановах па парадку прадастаўлення жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання асобным катэгорыям дзяржаўных служачых, паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт нагадаў, што ў лістападзе мінулага года ўжо разглядаліся прававыя аспекты фарміравання і прадастаўлення арэнднага жылля ў краіне. Тады былі старанна вывучаны ўсе новаўвядзенні з пункту гледжання максімальнага ўліку інтарэсаў грамадзян, а таксама ўлічаны замежны вопыт. Вынікам стаў указ кіраўніка дзяржавы, які ўнёс сур'ёзныя змены ў жыллёвую палітыку дзяржавы і ўступіў у сілу з 1 красавіка 2014 года. «Паколькі гэты дакумент закранае інтарэсы вельмі многіх людзей, неабходна з самага пачатку ўважліва сачыць за тым, як ён працуе на практыцы», — падкрэсліў беларускі лідар. Прэзідэнт таксама адзначыў, што ва ўказе былі вызначаны катэгорыі грамадзян, якія маюць права на першачарговае прадастаўленне адпаведнага жылля. Сярод іх — маладыя спецыялісты, навукоўцы, вайскоўцы, суддзі, супрацоўнікі пракуратуры і работнікі, прызначаныя на пасаду з пераездам у іншы населены пункт. «Акрамя таго, згодна з пералікам, які зацвярджаецца кіраўніком дзяржавы, такое жыллё атрымаюць дзяржаўныя служачыя, на якое яны маюць права, зыходзячы з характару выконваемай імі работы. Адпаведны пералік быў падрыхтаваны ўрадам. Аднак, як аказалася, да яго ёсць прэтэнзіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Але пры гэтым трэба памятаць, што жыць трэба па сродках. Не павінна быць ніякага несумленнага стаўлення да людзей у гэтым плане, не павінна быць выпінання пэўных катэгорый людзей. Усё павінна быць сумленна і справядліва, — падкрэсліў беларускі лідар. — У нас шмат хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, для іх такі спосаб — адзіная магчымасць вырашыць сваё жыллёвае пытанне».

Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады адказных чыноўнікаў па адпаведных пытаннях, звязаных з вылучэннем і наступным выкарыстаннем арэнднага жылля. Па выніках абмеркавання Прэзідэнт даў даручэнне дапрацаваць неабходныя праекты нарматыўных прававых актаў, але папярэдзіў, што ў іх не павінна быць ніякіх дадатковых ільгот і прывілеяў.

## ЧАТЫРЫ ЎКАЗЫ ДЛЯ АПК

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указы, падрыхтаваныя міжведамаснай рабочай групай для вырашэння праблемных пытанняў у аграпрамысловым комплексе, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Указ № 347 «Аб дзяржаўнай аграрнай палітыцы» накіраваны на ўдасканаленне механізмаў рэалізацыі аграрнай палітыкі і прадугледжвае меры па стварэнні эканамічных і прававых асноў для матываванага і эфектыўнага гаспадарання суб'ектаў у сельскай мясцовасці.

Нормы гэтага дакумента забяспечваюць выкананне міжнародных дамоўленасцяў, якія абмяжоўваюць выкарыстанне мер дзяржаўнай падтрымкі, што аказвае скажальнае ўздзеянне на гандаль.

Указ № 348 «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці работы арганізацый аграпрамысловага комплексу» накіраваны на вырашэнне гэтай задачы па некалькіх кірунках: за кошт стымулявання стварэння буйных арганізацыйных структур (агрaхолдынгаў) і за кошт паляпшэння ўмоў крэдытавання сельскагаспадарчых арганізацый.

Меры, прапанаваныя ў дакуменце, дадуць магчымасць стварыць умовы для стымулявання інтэграцыйных працэсаў у аграпрамысловым комплексе, зрабіць больш даступнымі крэдытныя рэсурсы, без якіх развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці немагчыма, вызваліць уласныя абаротныя сродкі гаспадарак на развіццё, павысіць эфектыўнасць іх функцыянавання.

Указ № 349 «Аб рэарганізацыі калгасаў (сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў)» устанаўлівае, што калгасы (СВК) да 31 снежня 2016 г. падлягаюць пераўтварэнню ў гаспадарчыя таварыствы або камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы.

Арганізацыйна-прававая форма юрыдычнай асобы, якая ствараецца ў выніку пераўтварэння калгаса, вызначаецца рашэннем агульнага сходу членаў калгаса. Пры пераўтварэнні калгаса ў гаспадарчае таварыства долі ў статутным фондзе гэтага таварыства размяркоўваюцца паміж фізічнымі асобамі — членамі калгаса, які пераўтвараецца, і адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай, на тэрыторыі якой ён размешчаны.

Згодна з указам, да юрыдычнай асобы, якая ствараецца пры пераўтварэнні калгаса, пераходзіць права карыстання зямельнымі ўчасткамі, а меры эканамічнага стымулявання, устаноўленыя калгасам, захоўваюць у дачыненні да яго сваё дзеянне.

Указ № 350 «Аб асаблівасцях пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі для рэспубліканскіх дзяржаўных патрэб» накіраваны на спрашчэнне правапрымяняльнай практыкі ў гэтай сферы, узаемнае захаванне і абарону правоў, інтарэсаў вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і яе нарыхтоўшчыкаў.

## РУПЛІЎЦЫ «АЛЬБЫ»



У старажытным парку «Альба», што каля Нясвіжскага палаца, праходзіць міжнародны валанцёрскі лагер «Спадчына Радзівілаў-2014». Валанцёры з Беларусі, Украіны, Расіі, Сербіі, Узбекістана, Арменіі і Кітая разам з рабочымі Клецкага лясгаса Нясвіжскага лясніцтва займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі парку, пасадкай дрэў у дэндрарыі. Арганізатарамі лагера з'яўляюцца Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» і Нясвіжскі райвыканкам.

Фота БЕЛТА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br201,6 трлн**

***склаў сёлета агульны аб'ём грашовых даходаў насельніцтва краіны ў студзені—маі. У разліку на душу насельніцтва — Br4 млн 260 тыс. у месяц, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Асноўнымі крыніцамі фарміравання грашовых даходаў насельніцтва з'яўляюцца аплата працы і трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншае). Аплата працы ў структуры грашовых даходаў насельніцтва ў студзені—маі гэтага года займала 63,7% супраць 63,8% у студзені—маі 2013 года, трансферты насельніцтву — 21,5% супраць 22,2%, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 9,5% супраць 9,3%, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 5,3% супраць 4,7%. Рэальныя наяўныя грашовыя даходы (грашовыя даходы за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэктаваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені—маі гэтага года ў параўнанні са студзенем—маем 2013-га павялічыліся на 6,3%.***

■ Наша «зорачка»

## АГУЛЬНАЯ МОВА

### Абсалютнай пераможцай у міжнароднай алімпіядзе па рускай мове баранавічанка Юлія Емельяновіч стала дзякуючы... сачыненню пра беларускую

**У міжнароднай алімпіядзе па рускай мове выбралі пяць абсалютных пераможцаў. Выпускніца 9 класа баранавіцкай гімназіі №2 Юлія Емельяновіч стала лепшай сярод іх. Адметна, што журы дзяўчына пакарыла не толькі выдатнымі ведамі па прадмеце, але і сачыненнем на вольную тэму пра... беларускую мову.**



### «КАЛІ СТРАЧВАЕЦЦА МОВА, МОЖА ЗНІКНУЦЬ НАЦЫЯ»

Юля — з тых дзяўчатак, якія сустракаюцца ўсё радзей. Са стыльнай стрыжкай, прыгожая без касметыкі — сапраўдная. У свае чатырнаццаць любіць Бродскага. Інтэлігентная. Выхаваная. Глыбокая. Цікаўная. Захопленая, здаецца, усім на свеце. «Яна такой нарадзілася, — усміхаецца мама Юлі Таццяна Уладзіміраўна. — Я падтрымліваю яе амаль ва ўсім».

— Алімпіяда навучыла мяне быць працейшай і дабрэйшай па жыцці, — расказвае пераможца. — Таму на кожнай алімпіядзе стараюся з некім пазнаёміцца: новыя людзі, думкі, пачуцці абавязкова потым спатрэбяцца.

На апошнім Юліным спаборніцтве было тры абавязковыя конкурсы — сачыненне, вусны лінгвістычны конкурс і іспыт па расійскім краіназнаўстве. З кожнай нацыянальнай каманды (усяго іх удзельнічала 17) выбіралі чалавека, які набраў у іх не сумарна, а паасобку максімальную колькасць балаў. З пяці абсалютных пераможцаў Юлія стала лепшай.

СТАР. 3

■ Абітурыент-2014

## У СТУДЭНТЫ — З ТРЫМА БАЛАМІ ПА ЦТ?

### Дабіраць на бюджэтныя месцы будуць аграрыяў, спартсменаў, ваенных і педагогаў

**Міністэрства адукацыі аб'явіла пра дадатковы набор ва ўстановы вышэйшай адукацыі на запатрабаваныя эканомікай і сацыяльнай сферай спецыяльнасці. Дадатковы набор будзе весціся толькі на бюджэтныя месцы, якія засталіся вакантнымі пасля залічэння абітурыентаў асноўнага набору.**

Па выніках аналізу сітуацыі з запаўненнем бюджэтных месцаў у шэрагу ВНУ быў вызначаны пералік спецыяльнасцяў, куды змогуць паступаць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе на бюджэтныя месцы падчас першай, асноўнай «хвалі» залічэння.

Да такіх спецыяльнасцяў аднесены: «Пачатковая адукацыя», «Матэматыка і інфарматыка», «Фізіка і інфарматыка», «Прафесійнае навучанне», «Матэматыка» (кірунак «Навукова-педагагічная дзейнасць»), «Фізіка» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Прыкладная матэматыка» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Прыродаахоўная дзейнасць» (экалагічны маніторынг), «Абсталяванне», «Транспарт», «Металургія» , «Энергетыка», «Лясная прамысловасць», «Хімічная прамысловасць», «Харчовая прамысловасць», «Лёгкая прамысловасць», «Аўтаматызацыя», «Землеўпарадкаванне, геадэзія, картаграфія і тапаграфія», «Ахова навакольнага асяроддзя», «Будаўніцтва», «Лясная гаспадарка і садова-паркавае будаўніцтва», «Забеспячэнне якасці» і «Музычнае мастацтва».

Прэтэндаваць на вакантныя месцы змогуць абітурыенты, якія паступалі на іншую спецыяльнасць або ў іншую ВНУ, але не прайшлі там па конкурсе. Галоўнае, каб яны мелі на руках патрэбны набор сертыфікатаў.

СТАР. 2



ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ТРАГЕДЫЯ Ў НЕБЕ УКРАІНЫ

**17 ліпеня стала вядома, што на тэрыторыі Украіны, непадалёк ад мяжы з Расіяй, упаў пасажырскі самалёт малайзійскіх авіяліній.**

«Boeing 777», які здзяйсняў рэйс Амстэрдам — Куала-Лумпур, разбіўся ў 16:30 у раёне населенага пункта Грабава Данецкай вобласці. 15 членаў экіпажа і 283 пасажыры загінулі. Спачатку было незразумела, як грамадзянскі самалёт мог ляцець над Данбасам, калі Украіна раней закрыла паветраную прастору ў раёне правядзення антытэрарыстычнай аперацыі. Аднак неўзабаве высветлілася, што па камерцыйных меркаваннях для грамадзянскіх судоў і бізнес-авіяцыі былі забаронены толькі палёты на ніжніх эшалонах, але вышэй за 320-ы эшалон (9750 метраў) паветраныя судны маглі перамяшчацца. Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка, які спачатку толькі не выключаў, што самалёт маглі збіць, бліжэй да паўночы сфармуляваў пазіцыю ўлад і наўпрост абвінаваціў у трагічным інцыдэнце сепаратыстаў, а таксама выказаў меркаванне аб магчымым дачыненні Расіі да катастрофы. У Расіі тым часам на фоне падазрэнняў Парашэнкі ў намеры нешта ўтаіць выступілі за міжнароднае расследаванне крушэння. Міждзяржаўны авіяцыйны камітэт на сваім сайце выказвае меркаванне, што «ў такой складанай сітуацыі неабходна стварыць пад эгідай ICAO міжнародную камісію па расследаванні катастрофы» і перадаць ёй бартавыя рэгістратары, так званыя «чорныя скрыні». Раней аб неабходнасці прыцягнення МАКа да расследавання заявіў кіраўнік Расавіяцыі Аляксандр Нерадзько. Пакуль міжнародныя назіральнікі рыхтуюцца прыбыць да месца катастрофы ў Данецкую вобласць, заходнія дзяржавы не спяшаюцца называць вінаватага авіякатастрофы, аднак, па даных СМІ, у Вашынгтоне схіляюцца да таго, што самалёт быў збіты сепаратыстамі. Адной з самых вострых тэм для абмеркавання ў расійскай і ўкраінскай інфармпрасторы стала пытанне аб тым, ці былі ва ўкраінскіх сепаратыстаў зенітныя ракетныя комплексы «Бук» і з чаго яшчэ маглі збіць пасажырскі самалёт. Першым «букі» ўзгадаў саветнік міністра ўнутраных спраў Украіны Антон Герашчанка. «Толькі што над Торэзам тэрарыстамі з зенітна-ракетнага комплексу «Бук» быў збіты грамадзянскі самалёт Куала-Лумпур — Амстэрдам. Сёння раніцай мясцовымі патрыётамі было зафіксавана перасоўванне гэтага комплексу з боку Торэза ў Снежнае», — напісаў Герашчанка на сваёй старонцы ў Facebook. Агенцтва «Новороссия» прыводзіць сведчанні відавочцаў аб тым, што лайнер быў разбураны яшчэ ў паветры, а за некалькі хвілін да катастрофы ў небе нібыта бачылі баявы самалёт, які выпускаў ракеты. Як сцвярджаецца, спачатку прагучалі выбухі, а затым з неба пачалі падаць абломкі. Пазней Міністэрства абароны Украіны запэўніла, што знішчальнікаў у паветранай прасторы над Данецкам не было. Згодна з нядаўняй заявай мінабароны РФ, у зоне паражэння малайзійскага «Боінга» былі зафіксаваны дзве ўкраінскія батарэі ракетнага комплексу С-200 і тры ўстаноўкі комплексу «Бук-М1». «Расійскімі радыётэхнічнымі сродкамі на працягу 17 ліпеня фіксавалася работа радыёлакацыйнай станцыі «Купал» батарэі «Бук-М1»», — распавёў прадстаўнік ведамства.

Узнімаецца ў прэсе і пытанне аб тым, навошта ўкраінскі авіядыспетчар павёў самалёт над зонай баявых дзеянняў. Існуе іншы калідор, па якім лайнеры ляталі дагэтуль. Аднак 17 ліпеня «Боінг» ішоў над «гарачай кропкай». Такога з пачатку хваляванняў яшчэ не было.

Тым часам «Белавія», як і многія іншыя авіякампаніі з ЗША, Кітая, Фінляндыі, Украіны і іншых краін, заявіла аб змяненні маршрутаў самалётаў праз усходнюю Украіну. Кіраўніцтва агульнаеўрапейскай арганізацыі дыспетчараў «Еўракантроль» пасля крушэння малайзійскага «Боінга» распарадзілася закрыць паветраную прастору Украіны для палётаў самалётаў грамадзянскай авіяцыі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Вярхоўнаму кіраўніку Малайзіі, Каралю Нідэрландаў і Генерал-губернатару Аўстралійскага Саюза ў сувязі з гібеллю грамадзян гэтых краін у выніку катастрофы самалёта малайзійскіх авіяліній. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.**

**«Ад імя народа Беларусі выказваю шчырыя і глыбокія спачуванні ў сувязі з жудаснай катастрофай самалёта «Boeing 777 »малайзійскіх авіяліній у небе над Украінай», — гаворыцца ў спачуваннях.**

ISSN 1990 - 763X

## АДКРЫЦЦЁ МІНУЛАГА — ДАРОГА ДА БУДУЧЫНІ

**У Мінску ў Міністэрстве замежных спраў адбылося адкрыццё выставы, прысвечанай аўтарскаму праекту Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага».**

Добра вядомы ў краіне і за яе межамі калекцыянер і гісторык пазнаёміў беларускіх дыпламатаў і кіраўнікоў дыпламатычных місій іншых дзяржаў у Мінску з рэпрадукцыямі старых паштовак са сваіх збораў. Тэматычна выстаўка падзялілася на дзве часткі. Першая — расповед з нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паштоўкі, выдадзеныя ў пачатку мінулага стагоддзя, паказваюць Мінск даўні, цікавы старымі будынкамі. І побач — здымкі, якія адлюстроўваюць разбурэнні і страты. Здымкі часоў Вялікай Айчыннай і першых пасляваенных гадоў. Гэтыя выявы дапаўняюць сучасныя фатаграфіі, якія падказваюць сучасны кантэкст старых адрасоў. Такі відэарад падштурхоўвае да многіх разваг, нагадвае пра зніклае і ўражвае зробленым. Другая частка выставы — старыя паштоўкі, прысвечаныя Першай сусветнай вайне. Падбор іх настолькі цікавы і грунтоўны, што дазваляе па-новаму паглядзець на падзеі стагадовай даўніны. Першая сусветная на паштоўках — гэта і няпростае жыццё на акупіраванай тэрыторыі, побыт, які арганізоўвалі не толькі мірныя нашы прашчуры, але і рускія і нямецкія салдаты.

СТАР. 3



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Медыяпрастора

# «НАРОДНЫЯ» СШЫТКІ НА ЛЮБЫ ГУСТ

**Літаральна ўчора ўбачыла свет абноўленая «Народная газета». Выданне, змяніўшы фармат і канцэпцыю, ператварылася ў ілюстраваны штотыднёвік з 64 палос, або трох тэматычных сшыткаў. Пра першыя вынікі, ключавыя тэмы і бліжэйшыя перспектывы сумеснага праекта медыяхолдынга «СБ.Беларусь сегодня» і рэдакцыі «Народнай газеты» расказвае галоўны рэдактар выдання Ігар САВОСЦЕНКА.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Віншуем з рэстартам! Вы задаволены вынікам ці, як часта бывае, хочацца яшчэ лепшага, большага, цікавейшага?***

— Спачатку, безумоўна, чытачы задавалі пытанні, чаму знікла газета штодзённая. Даводзілася тлумачыць, што газета не можа быць заўсёды аднолькавай, яна мяняецца гэтаксама, як і час. Сёння «Народная газета» — гэта тры сшыткі. Першы — грамадска-палітычны і сацыяльны, які асвятляе самыя розныя, найбольш важныя тэмы. Адметнасць у тым, што мы шукаем асоб — тут шмат інтэрв'ю, бліц-апытанняў, ліставанняў, вытрымак з форумаў і блогасферы, аўтарскіх калонак журналістаў, публіцыстаў і экспертаў. Хачу асабліва адзначыць, напрыклад, вершаваную калонку «Голас Пегаса» — кожны тыдзень чытачы даведаюцца з яе пра асноўныя падзеі ў краіне і свеце. Акрамя таго, у газеце досыць многа аналітыкі, расследаванняў і карысных са спажывецкага пункту гледжання артыкулаў. Другі сшытак — наш даўні праект «Союзное Вече», выданне Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, і трэці — тэматычны дадатак, які змяняецца кожны тыдзень. Пачалі мы, напрыклад, з тэмы здароўя. У наступны раз закранём любімую, мяркую, для большасці беларусаў тэму саду і агароду, працы на прысядзібным участку.

***— 64 старонкі — не толькі прыемны аб'ём для чытача, але і вялікі фронт работы для журналістаў. Ці хапае творчых рук?***

— Рук хапае, але паступова плануем прыцягваць да супрацоўніцтва пазаштатных аўтараў — як вядомых калумністаў і папулярных блогераў, так і тых людзей, якія з'яўляюцца прафесіяналамі ў сваёй сферы і пры тым умеюць трымаць пяро ў руках. Скажам, пра моду ў нас разважае вядомы мадэльер Саша Варламаў. Пазней з'явяцца і іншыя імёны, вядомыя ў музычным, тэатральным свеце, літаратуразнаўцы. Наша мэта — зрабіць газету не толькі цікавай у літаратурным сэнсе, «для душы», але і карыснай.

***— І, напрыклад, якія карысныя тэмы прапануеце чытачам у бліжэйшых нумарах?***

— Наогул, свае дадаткі мы прадумалі і запланавалі ўжо да Новага года. А неўзабаве чытачоў чакае мноства цікавінак: напрыклад, у наступным тэматычным дадатку будзе рубрыка «Куток самагоншчыка». Гэта ні ў якім выпадку не прапаганда п'янства, а збор незвычайных рэцэптаў дамашніх лекавых настоек і вінаў, якіх не купіш у краме. У спецвыпуску «Як падрыхтаваць дзіця да школы» будуць не толькі парады, як сабраць школьны ранец і колькі гэта сёння каштуе, але і расповед пра платныя і бясплатныя дадатковыя заняткі, гурткі, секцыі, куды можна накіраваць дзіця пасля школы. Будуць таксама спецвыпускі мастацкія — пра тэатр, кіно, спартыўныя — пра хакей, футбол, іншыя гульнявыя віды. Спадзяюся, усе яны атрымаюцца насычанымі і цікавымі для чытачоў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

# У СТУДЭНТЫ — З ТРЫМА БАЛАМІ ПА ЦТ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама да конкурсу на вакантныя месцы будуць дапушчаны і абітурыенты, якія не набралі на цэнтралізаваным тэсціраванні ўстаноўленую мінімальную колькасць балаў. Для іх мінімальны парог зніжаны на пяць балаў. Гэта значыць, што ў сертыфікатах па беларускай і рускай мове яны павінны мець 5 балаў і больш. Па матэматыцы, фізіцы, хіміі, і біялогіі — 10 балаў і больш. А па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі, замежных мовах — 15 балаў і больш.

Яшчэ больш лаяльнае стаўленне да абітурыентаў, якіх запрашаюць заняць вакантныя бюджэтныя месцы ва ўстановах вышэйшай адукацыі, што знаходзяцца ў падпарадкаванні Міністэрства абароны, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь, на ваенных факультэтах дзяржаўных ВНУ, у аграрных ВНУ, а таксама да будучых фізкультурнікаў і спартсменаў (кірунак «Фізічная культура і спорт»). Дадатковы набор будзе ажыццяўляцца на групу спецыяльнасцяў «Вытворчасць, захоўванне і перапрацоўка прадукцыі раслінаводства», «Жывёлагадоўля. Рыбагадоўля. Пчолагадоўля», «Сельскае будаўніцтва і ўладкаванне тэрыторый», «Меліярацыя і водная гаспадарка», «Аграінжынерыя».

Для абітурыентаў, якія будуць залічвацца ў рамках дадатковага набору на ўсе гэтыя спецыяльнасці, Міністэрства адукацыі зрабіла мінімальны парог, хутчэй, сімвалічным. Станоўчай будзе лічыцца адзнака ў сертыфікаце ЦТ у 3(!) балы. Прычым гэта датычыцца ўсіх экзаменацыйных дысцыплін цэнтралізаванага тэсціравання: рускай і беларускай мовы, матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі, гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўства, геаграфіі і замежных моў.

Тэрміны прыёму дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы на ваенныя спецыяльнасці — з 21 па 25 ліпеня, у «творчых» ВНУ — 27-28 ліпеня, ва ўсіх астатніх ВНУ — з 23 па 28 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Пошук інвестара




# УКЛАДВАЦЬ ГРОШЫ Ў МЫЛА І АЛЕЙ?

## Чаму б і не: пачалося першаснае размяшчэнне акцый (IPO) Гомельскага тлушчавага камбіната

**Для гэтага прадпрыемства выпусціла дадаткова 4,035 млн простых акцый намінальным коштам 18 800 беларускіх рублёў за штуку на суму 75 млрд 858 млн. Размяшчэнне каштоўных папер будзе ажыццяўляцца шляхам адкрытага продажу на біржавым рынку ў гандлёвай сістэме ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа». Акцыі дадатковай эмісіі будуць рэалізоўвацца фізічным і юрыдычным асобам, рэзідэнтам і нерэзідэнтам Беларусі без абмежаванняў.**

### Усё ўжо зроблена, трэба толькі вярнуць даўгі

Кіраўніцтва камбіната адкрыта паведамляе, што прыцягнутыя сродкі плануюць выкарыстаць для рэфінансавання інвестыцыйных крэдытаў, якія ўзялі на мадэрнізацыю вытворчасці. «У нас быў небагаты выбар — выходзіць на рынак запазычанняў з абяцаннямі абнавіць тэхналагічнае абсталяванне ці зрабіць гэта самастойна і прапанаваць інвестарам стаць акцыянерамі ўжо мадэрнізаванага прадпрыемства», — патлумачыў дырэктар прадпрыемства Дзмітрый Бабундзін. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што ўмовы размяшчэння, якія ўзгоднены з кіраўніком дзяржавы, не змяшчаюць ніякіх абмежаванняў для патэнцыйных інвестараў. Купіць можна любую колькасць акцый у межах дадатковай эмісіі. Няма абмежаванняў і для замежнікаў. «Стратэгічнаму інвестару няма неабходнасці весці доўгія перамовы і ўзгадненні. Дастаткова праз біржавога брокера выставіць заяўку на біржу», — удакладніў дырэктар.

«Што тычыцца фізічных асоб, грамадзян і неграмадзян Беларусі, то для іх таксама ствараецца добрая магчымасць для размяшчэння свабодных грашовых сродкаў на доўгі тэрмін. Кошт адной акцыі невялікі, а гэта робіць іх даступнымі для шырокага кола пакупнікоў. Фізічныя асобы могуць купіць акцыі ў цэнтрах банкаўскіх паслуг Беларусбанка па ўсёй краіне», — заявіла намеснік старшыні канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Марына Міхальцэвіч. І насамрэч: у першыя ж хвіліны таргоў паступіла некалькі заявак на куплю 100 акцый і была адна заяўка на куплю ўсяго трох каштоўных папер. Відавочна, што цікавасць да акцый прадпрыемства выказалі звычайныя людзі.

### Пакуль не вельмі выгадна, але ёсць перспектыва

У той жа час, частку сродкаў, атрыманых ад IPO, прадпрыемства плануе накіраваць на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў. У першую чаргу ставіцца задача рэканструяваць усю энергасістэму камбіната, каб знізіць выдаткі. Па-другое, ёсць намер пашырыць уласную базу па перапрацоўцы алейных культур, з якіх тут атрымліваюць алей — асноўны сыравінны кампанент. І па-трэцяе, існуе перспектыўны план па пашырэнні вытворчых магутнасцяў.

Па стане на 1 мая 2014 года памер статутнага фонду ААТ «Гомельскі тлушчавы камбінат» складае больш за 233 млрд рублёў, ён падзелены на больш чым 12 млн простых акцый. Доля дзяржавы ў статутным фондзе складае 99,43%, фізічных асоб — 0,4%, юрыдычных асоб — 0,17%. Калі ўсе акцыі будуць прададзены, то ў дзяржавы застанецца 75,01% акцый камбіната.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**
**Гомельскі тлушчавы камбінат уведзены ў эксплуатацыю ў 1932 годзе. У студзені 2005 года прадпрыемства пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства. З'яўляецца найбуйнейшым у Беларусі прадпрыемствам алейна-тлушчавай галіны. Выбрабляе алей, маргарынавую прадукцыю, маянэзы, соусы на аснове маянэзу, кетчупы, мыла.**

Дарэчы, па выніках працы за 2013 год пры рэнтабельнасці продажаў 6,8% Гомельскі тлушчавы камбінат атрымаў прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі ў суме 37,9 млрд рублёў, чысты прыбытак — 1,3 млрд. У першым квартале 2014 года прадпрыемства спрацавала стратна, аднак за апошнія два месяцы прыбытак стаў расці — кіраўніцтва бачыць у гэтым эфект ад мадэрнізацыі. Бізнес-планам разлічана, што да канца года камбінат выйдзе на добрую прыбытковасць. Калі гэта спраўдзіцца, то акцыі прадпрыемства могуць стаць выдатным інструментам для захавання і памнажэння сваіх зберажэнняў. Пакуль што аб гэтым казаць не выпадае: дывідэнды па выніках 2013 года склалі 184,88 рубля на кожную акцыю. Атрымліваецца, што даход быў роўны менш за 1% гадавых.

Завершыцца першаснае размяшчэнне акцый Гомельскага тлушчавага камбіната з продажам апошняй акцыі дадатковага выпуску, але не пазней за 1 верасня гэтага года.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ На слыху

# КАМУ ГЭТА ТРЭБА?

## Прынятае рашэнне аб пошлінах на імпарт нашых тавараў карысці Украіне не прынясе

**Як стала вядома днямі, Украіна збіраецца ўвесці пошліны на імпарт шэрагу тавараў з Беларусі — кандытарскіх вырабаў, малочнай прадукцыі, электрычных лямпачак напальвання, угнаенняў, халадзільнікаў, гумовых шын, соладавага піва і камплектуючых халадзільнага абсталявання. Адносна трох апошніх пазіцый пошліна складзе 60,05% ад мытнага кошту, для астатніх — 55,29%.**

Так вырашыла Міжведамасная камісія па міжнародным гандлі Украіны. Да ўступлення ў сілу гэтага рашэння засталося яшчэ некалькі дзён. А дзейнічаць яно будзе да 31 снежня 2016 года.

Прынятае рашэнне, на думку экспертаў, не прынясе нічога добрага Украіне. Аб гэтым ужо выказваўся намеснік старшыні Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі, эканаміст Георгій Грыц у эфіры тэлеканала АНТ. Спецыяліст звярнуў увагу на тое, што каля 70% нашага экспарту ва Украіну складаюць светлыя нафтапрадукты, аднак гэтую прадукцыю пошліны не закранулі. Акрамя таго, карэспандэнту «Звязды» пракаментавала сітуацыю Галіна Турбан, загадчыца кафедры міжнароднага бізнесу Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, кандыдат эканамічных навук, дацэнт: «Украіна — член Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Таму ўводзіць нейкія дадатковыя пошліны яна не можа — усе стаўкі зафіксаваны. Падобнае рашэнне нашай суседкі магло быць зроблена толькі на аснове пэўнага расследавання». Так яно і было. Міжведамасная камісія па міжнародным гандлі 1 ліпеня разгледзела справаздачу Міністэрства эканамічнага развіцця і гандлю Украіны аб выніках расследавання па выяўленні фактаў дыскрымінацыйных ці несяброўскіх дзеянняў з боку Беларусі адносна законных правоў і інтарэсаў украінскіх экспарцёраў кандытарскіх вырабаў. Нагадаем, што Беларусь увяла з 1 чэрвеня ліцэнзаванне імпарту кандытарскіх вырабаў і сыравіны для іх вытворчасці з-за межаў Мытнага саюза. Гэта часовы захад, які будзе дзейнічаць да 30 лістапада 2014 года. Таксама сёлета з 1 мая па 31 кастрычніка ліцэнзаванню падлягае імпартнае піва.

Беларускае Міністэрства замежных спраў адрэагавала на дзеянні ўкраінцаў нязгодай. Пазіцыя тлумачыцца тым, што ліцэнзаванне імпарту асобных тавараў у нашу краіну распаўсюджваецца на нявызначанае кола дзяржаў, а не выключна супраць Украіны. «Беларусь у СГА пакуль што не ўваходзіць. Таму да нашых тавараў могуць быць прыменены любыя абарончыя захады з боку партнёраў. Аднак такія «гандлёвыя войны» ніколі не прыводзяць да добрага ні для аднаго з бакоў канфлікту», — лічыць Галіна Турбан.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

НАВІНЫ

## ПЕРШЫЯ ТЫСЯЧНІКІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

**Першую тысячу тон збожжа на Гомельшчыне (18.07) намалацiў экіпаж камбайнераў агракамбіната «Холмеч» з Рэчыцкага раёна. Васіль Коваль і Віталь Ільеў выдалі з бункера камбайна «Лексіён-760» 1103 тоны збожжа. Для гэтага ім спатрэбілася 5 дзён працы.**

Дарэчы, летась экіпаж гэтых механізатараў заняў першае месца на ўборцы збожжавых і прадстаўляў Гомельскую вобласць на рэспубліканскіх «Дажынках». У гэты ж дзень і другі экіпаж гэтай гаспадаркі ў складзе Аляксандра Граня і Сяргея Пісарэнкі перасягнуў тысячную мяжу па намалоце збожжа. Таму прадстаўнікі абласнога аб'яднання прафсаюзаў, абласныя і раённыя ўлады ўшаноўвалі першых тысячнікаў разам. Перадавікам уручылі ганаровыя дыпломы і падарункі непасрэдна на полі. Трэба адзначыць, што ў гаспадарцы сёння з кожнага гектара збіраюць па 70 ц збожжа — гэта лепшы паказчык не толькі ў раёне, але і ў Гомельскай вобласці. На палях агракамбіната «Холмеч» працуе 10 экіпажаў. Ужо прыбрана 834 га, намалочана больш за 5840 тон збожжа.



Віталь ІЛЬЕЎ (злева) і Васіль КОВАЛЬ.

Як паведаміў старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Сяргей Мятліцкі, хлебаробы Гомельскай вобласці ўжо ўбралі 44,3 тыс. га збожжавых, што складае 11,8% ад плана. Намалочана 142,5 тыс. т збожжа. Сярэдняя ўраджайнасць складае 32,2 ц, што на 4,4 ц больш за леташні вынік.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ПАДЗЕІ

## ДЗІКІХ ЖЫВЁЛ САМАВОЛЬНА ДАДОМУ НЕ БРАЦЬ

**Усім, хто любіць аднесці дадому параненых або хворых жывёл, пазбаўляючы апошніх магчымасці жыць у звыклых умовах, давядзецца папрацаваць над сваёй чуллівасцю. Пастановай Савета Міністраў цяпер забараняецца браць з лесу дзікіх жывёл.**

Як паведамляюць у Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, калі вы знайшлі хворую, параненую, траўмаваную дзікую жывёлу, неабходна адразу паведаміць пра гэта карыстальніку паляўнічага ўгоддзя, або ў аператыўна-дзяжурную службу тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, або ў дзяжурную службу райаддзела па надзвычайных сітуацыях. Інфармацыя будзе перададзена ў тэрытарыяльны орган Міністэрства прыродных рэсурсаў, раённую або гарадскую ветэрынарную станцыю. Прадстаўнікі дзяржаўных органаў выедуць на месца, каб прыняць рашэнне аб далейшым лёсе жывёлы. Дзікая жывёла можа быць перададзена на ўтрыманне грамадзяніну, індывідуальнаму прадпрымальніку або юрыдычнай асобе з яе згоды.

Тэрытарыяльныя органы міністэрства могуць выдаць пералічаным катэгорыям дазвол на адлоў дзікіх жывёл для іх далейшага ўтрымання і развядзення толькі пры наяўнасці адпаведных умоў размяшчэння (напрыклад, прасторнай вальеры).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ЗБЯРЭМ ПАРТФЕЛЬ ПЕРШАКЛАСНІКУ!

**У панядзелак 21 ліпеня ў Мінску стартуе дабрачынная акцыя «Партфель першакласніка».**

Акцыя пройдзе ў ЦУМе, ГУМе, універмагах «Беларусь» і «Кірмаш», у гандлёвым доме «На Нямізе». Прадоўжыцца яна да 25 жніўня. Прыняць удзел у акцыі можа кожны ахвотны. Для гэтага трэба ў адной з названых крам купіць што-небудзь са школьных прылад для будучых першаклашак з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, а валанцёры перададуць іх у Беларускую асацыяцыю шматдзетных бацькоў.

**Святлана БУСЬКО.**

ФАКТЫ

## ПЕРАХОД НЕ ВЫРАТАВАЎ

**Жахлівае здарэнне адбылося на дарозе «Мінск—Мікашэвічы». На вачах у маці пад коламі аўтамабіля загінула 8-гадовая дзяўчынка.**

Як паведамілі ва Упраўленні дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў, трагічны выпадак здарыўся 17-га ліпеня ў 17:00 каля вёскі Беліца, што ў Мінскім раёне. 61-гадовы жыхар сталіцы пад'язджаў да нерэгуляванага пераходу і не звярнуў увагі на тое, што кіроўцы на суседніх палосах зніжаюць хуткасць, каб прапусціць пешаходаў. У выніку — наезд і смерць чалавека. Як кажуць відавочцы, усё гэта адбылося на вачах у маці загінулай.

У першым паўгоддзі па прычыне парушэння правілаў праезду адбылося 265 дарожна-транспартных здарэнняў. 43 з іх звязаны з наездамі на дзяцей. У выніку трое няпоўнагадовых загінулі, а 40 грамадзян атрымалі раненні. І толькі ў чатырох выпадках вінаватымі былі дзеці, якія пераходзілі праезную частку на забараняльны сігнал святлафора.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» глыбока смуткуе з нагоды смерці былога супрацоўніка часопіса «Вожык» САКОВІЧА Паўла Паўлавіча і выказвае спачуванні родным і блізкім нябожчыка.**

**ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ**
**по объекту «12-этажный жилой дом со встроенными помещениями № 31 (по генплану) в микрорайоне Малиновка-6. Встроенные помещения»,**
*опубликованную в газете «Звязда» № 81 за 03.05.2014*

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается:**

- 1 (одна) однокомнатная квартира общей площадью 39,49 кв.м на 1-ом этаже жилого дома стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 350 долларов США** по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 28.07.2014. До заключения договора создания объекта долевого строительства обязательно осуществляется предварительный осмотр объекта долевого строительства. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20, к. 2, тел.: (017)200-06-85, (044)795-44-44.

УНП 190579681

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ №№ 0569490, 0567111, полис по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР № 3793709 **считать недействительными.**

УНП 100122726

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | **Капитальное строение, инв. № 400/С-69052 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта), площадью 116,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121/4** |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Максима Горького, 121/4 |
| **Лот расположен на земельном участке** | Кадастровый номер 440100000002007937, площадью 0,031 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания канализационной насосной станции) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121/4. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код – 13,5, площадь – 0,0102 га |
| **Начальная цена продажи** | 251 318 565 (двести пятьдесят один миллион триста восемнадцать тысяч пятьсот шестьдесят пять) белорусских рублей без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 12 565 929 (двенадцать миллионов пятьсот шестьдесят пять тысяч девятьсот двадцать девять) белорусских рублей |
| **Продавец** | Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |
| **Аукцион состоится 31 июля 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 21.05.2014 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 25 июля 2014 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

■ Беражыце сябе!

# ТУТ ТАБЕ І СОНЕЧНЫ ЎДАР, І ГІПЕРТАНІЧНЫ КРЫЗ

## Як атрымаць ад + 30 °С задавальненне, а не праблемы

**Ва ўмовах спякотнага надвор'я, якое ў нашых шыротах дапаўняецца яшчэ высокай вільготнасцю, людзі з хранічнымі захворваннямі, дзеці і старыя рызыкуюць сутыкнуцца з неспрыяльнымі наступствамі для свайго здароўя. Хоць у цэлым любы чалавек трапляе ў такую групу рызыкі, калі не вытрымлівае элементарных мераў засцярогі.**

У першую чаргу ў спёку чалавеку пагражае абязводжванне, сонечны або цеплавы ўдар, апёкі скуры. Акрамя таго, у некаторых людзей з сардэчна-сасудзістай паталогіяй павышаецца артэрыяльны ціск і нават развіваюцца гіпертанічныя крызы.

Паводле слоў **намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай часці Мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Паўла УДОТА,** колькасць зваротаў, звязаных з цеплавымі і сонечнымі ўдарамі, а таксама з сонечнымі апёкамі, год ад года скарачаецца, што, верагодна, тлумачыцца ростам агульнай інфармаванасці насельніцтва. «Калі вы не ўпэўнены ў ступені шкоды, нанесенай вам сонечнымі промнямі (а далёка не кожны здольны самастойна ацаніць, скажам, ступень пашкоджання скуры пры атрыманні сонечнага апёку), то варта ўсё ж такі звярнуцца па медыцынскую дапамогу», — кажа спецыяліст.

**Што спрыяе сонечнаму ўдару?** Працяглае знаходжанне пад адкрытым сонцам. Пры такім раскладзе мы можам перагрэцца і страціць вялікую колькасць вільгаці.

**Што спрыяе цеплавому ўдару?** Высокая тэмпература і вільготнасць паветра. Фізічная праца ў скураным, гумавым, сінтэтычным адзенні. Працяглае знаходжанне ў памяшканні з дрэннай вентыляцыяй. Доўгачасовыя прагулкі і агульная стомленасць арганізма.

**Галоўны пазаштатны амбулаторна-паліклінічны тэрапеўт Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Наталля МЫСЛІЎЧЫК** нагадвае аб асноўных правілах паводзін у дні, калі тэмпература паветра ўзнімаецца вышэй за 23-25 градусаў:

1 Пазбягайце працяглага знаходжання на сонцы з 11.00 да 16.00. Не забывайцеся на галаўныя ўборы, лёгкае натуральнае адзенне. Не спіце на сонцы.

2 Асцерагайцеся пераахалоджвання. Розніца тэмператур паміж вулічнай і той, што ўстанаўліваецца ў памяшканні з дапамогай кандыцыянера, павінна складаць не больш за 5 градусаў. Не сядзіце блізка да вентылятара, кандыцыянера.

3 Здаровым людзям неабходна павялічыць ужыванне вадкасці — да 2,5-3 л у дзень. Гэта павінны быць несалодкія кампоты з сухафруктаў, морсы, зялёны халаднаваты чай, негазаваная пітная вада. Толькі не ледзяныя. Пры наяўнасці сардэчна-сасудзістых паталогій істотна павялічваць колькасць вады не варта, паколькі можна справакаваць ацёчнасць і выклікаць новыя праблемы са здароўем.

4 Мерайце артэрыяльны ціск, сачыце за пульсам. Хворым з артэрыяльнай гіпертэнзіяй можна рэгуляваць дазіроўку лекаў толькі пасля ўзгаднення з урачом. Усё ж такі высокая тэмпература паветра на розных людзей уздзейнічае па-рознаму: у некага артэрыяльны ціск можа паніжацца, а некаму гэта пагражае гіпертанічным крызам.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Размовы на кухні

# НЕ ПАДМАЖАШ — НЕ ПАЕДЗЕШ

## Куды збегчы ад працы і не згалець?



**Як толькі ў навінах свайго акаўнта ў сацыяльных сетках ты пачынаеш бачыць выключна фотаздымкі аголеных людзей на пляжы або сяброў у смешных позах насупраць вядомых сусветных славутасцяў, значыць, канчаткова прыйшло лета. Карацей, сезон адпачынкаў запрацаваў напоўніцу. Вычвараюцца, прабачце, усе, як могуць: хто едзе ў экзатычны Тайланд, хто збягае ў амаль ужо родную для некаторых Турцыю, хто патрыятычна застаецца ў межах краіны. Аднак адпачываюць усе. А вось колькі каштуюць розныя канікулы беларусам?**



### МОРА АБСТАВІН

**Сяргей Куркач** — У апошнія два гады нам не шчасціла на цывілізаваны адпачынак усёй сям'ёй. Летась сярэдняя дачка паехала ў літоўскі санаторый, старэйшая — адпачывала з сяброўкай на Браслаўскіх азёрах, а мы з жонкай і маленькім сынам чакалі іх дома. Ужо тады, летась, катэгарычна вырашыў з'ездзіць усёй сям'ёй на Чорнае мора ў Крым. Складалі маршруты, адкладвалі грошы. Не паспелі...

**Уладзіслаў Кулецкі** — Нічога, яшчэ паспееце. Крым жа нікуды не падзеўся і мора не высахла. Ёсць, зразумела, пэўная праблема з «транспарціроўкай» вашай каржакаватай постаці, аднак варыянты знайсці можна.

**С. К.** — Пра сябе асабіста я ўвогуле маўчу — і стоячы ў маршрутцы праеду. У мяне ж яшчэ трое дзетак і жонка, для якіх такі складаны маршрут (праз Маскву ды з перасадкамі) будзе вельмі стомным. Да таго ж па грошах невядома, што атрымаецца. Хутчэй за ўсё, нам такая вандроўка будзе не па кішэні. Трэба, відаць, шукаць айчынны варыянт.

**У. К.** — Ну чаго вы ўжо так хутка ад мары адмаўляецеся? Давайце паглядзім, колькі ўсё разам будзе каштаваць, і прыцэнімся. Можа быць, не ўсё згублена. Глядзіце: да Масквы можна даехаць на аўтобусе (на пяцярых гэта абыдзецца ў 370 долараў туды і назад), а потым на самалёце да Сімферопаля (630 долараў на ўсіх). Увогуле — прыкладна «штука баксаў». Цяпер паглядзім на жыллё. Хутчэй за ўсё, вы паедзеце на два тыдні. Паколькі ў суткі больш-менш добрая кватэра ў Алушце будзе каштаваць каля 40-50 долараў, то вам спатрэбіцца яшчэ 600-700 «зялёных». Ды, натуральна, патрэбна яшчэ нейкія грошы мець з сабою. На ежу, падарункі і экскурсіі нават у бюджэтным варыянце пойдзе яшчэ тысяча долараў.

**С. К.** — Падлічыў і праслязіўся... Тры тысячы за два тыдні для беларускай шматдзетнай сям'і — дробязі? Мабыць, ты так і лічыш? Пайду друкарскі станок пазычу.

**У. К.** — Не так ужо гэта і шмат. Вось паглядзіце: напрыклад, у Турцыю вы ўсёй сям'ёй зможаце за гэтыя грошы паехаць толькі на адзін тыдзень. Аднак там лепшы сэрвіс, утульны атэль і знакамітае «ўсё ўключана». Хаця сядзець давядзецца толькі ў гатэлі. Каб паехаць яшчэ кудынебудзь, у вас ужо не застанецца грошай. А ў Крым мы з бацькамі раней заўсёды ездзілі, мне там вельмі падабалася. Можа быць, яшчэ калі патраплю на гэты цудоўны паўвостраў.

### АГУРКІ РАСТУЦЬ НА... ДРЭВАХ

**С. К.** — Ну, можа, у наступным годзе падумаю. Сёлета я вырашыў малых мясцовай прыродай «пабалаваць». Сёння для гарадскіх жыхароў модным трэндам лічыцца адпачынак на аграсядзібах. Людзі туды сем'ямі на выхадныя ездзяць і плацяць вялікія грошы (у сярэднім каля 30 долараў у суткі). Мае бацькі жывуць у райцэнтры, але маюць прыватны дом з усімі выгодамі на ўскрайку горада. Там табе і агарод, і цудоўны сад, і лес не так далёка — 10 хвілін на ровары. Сёлета, як толькі клубніцы пайшлі, мы дзвюх дачок туды адпачываць і адправілі. Праз тыдзень і я з шасцігадовым сынам паеду. Мой малы наследнік ужо з вясны марыў зноў агуркі з дрэва пазбіраць...

**У. К.** — Сяргей Андрэевіч, а вы перад працай нічога не курылі? Ці, можа, вам у галаву напякло? Я таксама не супраць «зялёнага» турызму, аднак лепш у горадзе пасядзець, чым па агуркі на дрэвы лазіць (я яшчэ з глузду, здаецца, не з'ехаў)...

**С. К.** — Як не верыш вачам, то памацай сам. Справа тут у тым, што мой бацька агуркі па спецыяльнай тэхналогіі вырошчвае: укопвае доўгія жэрдкі, па якіх потым агуркі ўверх і паўзуць. А летась такія «градкі» мы побач з яблынямі арганізавалі. Агуркі на яблыні і залезлі. Потым мы іх разам з яблыкамі з дапамогай лесвіцы здымалі. Цікавая такая аперацыя атрымалася, што майму малому ў дзіцячым садку выхавацелькі адразу і не паверылі. А як яму падабаецца есці з кустоў маліны, клубніцы і іншую смакату! Аднак сёлета ў мяне галоўнай задачай будзе — пазнаёміць яго з лесам. Пакуль ён толькі па кніжцы ведае, якія грыбы ядомыя, а якія чапаць увогуле не трэба. Не ўсіх звяроў ды птушак мы яшчэ вывучылі.

**У. К.** — О, лес і я вельмі люблю. Лепей за шпацыр на прыродзе, бадай, нічога няма. Сапраўды, танны і карысны адпачынак — у вёсцы. Асабліва для дзяцей. Тым больш, для хлопчыка. Вы ж, напэўна, яго захочаце і нечаму па гаспадарцы навучыць?

**С. К.** — З малога хлопчыка мужчыну трэба рабіць ужо цяпер. А то што ж атрымліваецца: гарадскі дашкольнік сёння ў руках толькі камп'ютарную «мышку» трымаць можа. А я свайму сёлета маленькую матычку набыў — будзе мне дапамагаць змагацца з пустазеллем. Ёсць у яго і вядзерца для вады — няхай разам з бабуляй кветкі палівае. Я і сам не на асфальце нарадзіўся, таму і не жадаю, каб мой сын бела934ручкам вырас. Вось адначасова і бацькам маім дапаможам, і малы стане больш моцным.

### ДАРАГАЯ МАЯ КВЕТАЧКА

**У. К.** — Добра, скончым з гэтым бюджэтным аграэкатурызмам. Ёсць і іншыя варыянты беларускіх канікул. У нас шмат санаторыяў і дамоў адпачынку. А як прыгожа на беларускіх азёрах... Вось толькі цэннікі «кусаюцца»: у нармальны санаторый менш чым за 300-400 тысяч (а часта і больш) у суткі не патрапіш. А каб зняць дамок на Браславах, спатрэбіцца ад 10 да 90 долараў — у залежнасці ад магчымасцяў і апетытаў. Але ўсё роўна так хочацца адпачыць на радзіме. Можа паспрабуем што-небудзь адшукаць, Сяргей Андрэевіч?

**С. К.** — Ды што ты! Там нашы суседзі, расіяне, яшчэ з зімы ўсё забраніравалі. Можна толькі на наступны год пашукаць... Хіба што паспрабаваць па прафсаюзнай лініі на працы. Там яно на 20% танней будзе. Але існуе і пэўны мінус — атрымаеце не тое, што вам даспадобы, а тое, што засталося. Аб гэтым я дакладна ведаю. Напрыклад, у добра вядомы санаторый у Лепелі на летні сезон пуцёвак ужо не знойдзеш. А ў верасні-кастрычніку ў нас, зразумела, дажджы, таму і попыт у гэты час на падобны адпачынак ужо невялікі. Слухай, а што гэта ў цябе ў куточку стаіць? Ці не палатка? Вырашыў «дзікуном» на айчынныя краявіды паглядзець?

**У. К.** — А што смешнага? Ну сабраўся. Я малады, моцны. Мне падабаецца актыўны адпачынак. Гэта лепш, чым адлежваць пэўныя часткі цела на пляжы. Ды і за розныя гасцініцы ці санаторыі плаціць не трэба. А вы што гэта — зайздросціце, ці што? Зразумела, з вашым узростам і гм... ростам ужо з заплечнікам не пабегаеш — прыцісне яшчэ да зямлі чаго добрага... Экстрым не для вас.

**С. К.** — Ты мне ўзростам вока не калі, малады чалавек. Некалі і я быў у стане: маладосць — усё дурносць. Гадоў дваццаць таму з будучай жонкай разам з кампаніяй ад універа ў Карпацкія горы хадзілі. Пачуцці там правяралі. І я са сваім невялікім ростам быў не апошнім хлопцам. Горы быццам і не асабліва высокія, але асобныя ўчасткі як для скалалазаў зроблены. Аднак мяне яны не спужалі. Убачылі мы са Светай на адной скале цудоўную кветачку. Я здагадаўся, што краска ёй вельмі спадабалася, і тут жа палез угору. Не заўважыў, як дабраўся да кветкі, але злезці без адпаведнай амуніцыі ўжо не ведаў як. Спускаўся потым іншым шляхам: зрабіў добры крук на пару кіламетраў. А жонка гэтую кветачку на ўсё жыццё запомніла. Дарэчы, у той паход нам усю экіпіроўку праз універ выдавалі. Ты ж, відаць, усё сам набываў? Дарагавата, напэўна...

— Гэтая думка прыйшла не мне, а майму настаўніку, таленавітаму журналісту Усеваладу Карамышаву. Ён у тыя гады, калі я вучыўся ў Маскоўскай ваенна-палітычнай акадэміі, быў рэдактарам нашай акадэмічнай шматтыражкі і ўсяляк заахвочваў мае журналісцкія спробы. Ён жа з адабрэннем адгукнуўся і на маё першае апавяданне, якое я даслаў яму. «Кідай страчыць заметкі, — быў яго прысуд. — Пішы апавяданні». Лёгка сказаць — пішы. Але калі? Першыя два гады службы пасля заканчэння акадэміі я наогул працаваў без выхадных. Але потым, дзякуй Богу, справа патроху стала наладжвацца, і я ўзяўся за пяро зноўку. Некалькі маіх апавяданняў апублікаваў часопіс «Советский воин». Але часцей за ўсё я друкаваўся ў нашай армейскай газеце «Часовой Севера».

І вось калі я ўжо, здавалася, набыў у сваіх колах пэўную вядомасць і прызнанне, раптам нечаканая непрыемнасць. Камандуючы нашай паветранай арміяй, выступаючы на ваенным савеце, даволі рэзка прайшоўся па маёй персоне. «Падпалкоўнік Сульянаў актыўна выступае ў друку, — з раздражненнем сказаў ён. — Але галоўная ваша задача, таварыш Сульянаў, не заметкамі займацца, а вучыць, выхоўваць лётны састаў». Калі таму ж камандуючаму прынеслі спіс, каго трэба заахвоціць да Дня друку, мяне ён са спіса выкрасліў. І тады я зразумеў, што ў арміі займацца літаратурай нельга. Я стаў пісаць «у стол». А калі ўжо праслужыў у палку некалькі гадоў, аўтарытэт мой вырас (наш полк стаў лепшым з дзевяці палкоў арміі), вось тады я зноў дазволіў сабе друкавацца. І неўзабаве, у 1967 годзе, нават выдаў першую кнігу апавяданняў «На земле и в воздухе».

**— І нарэшце адчулі сябе пісьменнікам?**

— Ну што вы! Да гэтага было яшчэ далёка. Толькі праз пятнаццаць гадоў, працуючы ўжо ў Мінску, я выдаў раман «Расколотое небо», прадмову да якога напісаў Васіль Быкаў. І тут, у гэтым кароткім уступным слове, вядомы пісьменнік даў майму сціпламу твору такую характарыстыку: «Я не ведаю ў сучаснай савецкай літаратуры іншага аўтара, які б з такім грунтоўным веданнем і зайздросным пранікненнем у самае запаветнае пісаў аб Узброеных Сілах краіны».

## З ЛЮБОЎЮ І НЯНАВІСЦЮ ЗЯМНОЮ

**— Анатоль Канстанцінавіч, ёсць тры кнігі, якія ў вашай творчасці стаяць нібыта асобна. Гэта — «Маршал Жуков. Слава. Забвение. Бессмертие», «Пушкин, Элиз Кутузова и Долли Фикельмон», «Арестовать в Кремле». Яны выраслі не з асабістага вопыту. І нават не з асабістых назіранняў. Што ж стала прычынаю іх з'яўлення?**

— У кожнай з гэтых кніг свая гісторыя. Пра маршала Жукава, напрыклад, упершыню з'явілася думка напісаць недзе на пачатку перабудовы. Менавіта тады на выдатнага палкаводца сталі выліваць цэбры бруду. Невыносна было слухаць, як з экранаў тэлевізараў так званыя дэмакраты, якія не нюхалі пораху і блізка не ведалі, што такое вайна, глуміліся з герояў Вялікай Айчыннай, абвінавачвалі ва ўсіх смяротных грахах таленавітых савецкіх военачальнікаў, і ў першую чаргу Георгія Канстанцінавіча Жукава.



Паміж гэтымі фотаздымкамі ляжыць адрэзак часу ў восемдзесят гадоў. Першае фота зроблена ўчора ў рабочым кабінеце Анатоля Канстанцінавіча Сульянава. Другое — восемдзесят гадоў таму, калі вядомы камбрыг Сяроў падарыў сямігадоваму Анатолю салдацкую пілотку і сказаў прарочае: «Бласлаўляю быць лётчыкам...».

Я зразумеў: больш маўчаць не змагу. Пра Жукава я ўжо многае ведаў. І не па чутках, а, што называецца, з першых рук — ад тых, хто побач з ім ваяваў, працаваў. Яшчэ ў канцы 1960-х я блізка пазнаёміўся з генерал-лейтэнантам Цялегіным. Ён звёў мяне з маршалам Ракасоўскім, з якім мы аднойчы правялі на рыбалцы цэлых паўдня. Гэта ўсё людзі, якія блізка ведалі Жукава. І яны мне расказалі вельмі шмат цікавых эпізодаў з жыцця легендарнага палкаводца. Самі вядомыя, таленавітыя военачальнікі, яны, тым не менш, гаварылі пра Жукава з захапленнем, з нязменным піетэтам.

Тое ж самае я чуў з вуснаў маршалаў Баграмяна, Рудэнкі, Чуйкова, з якімі мне давялося мець цесныя зносіны падчас іх прыезду ў Мінск з нагоды 35-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І вось у адзін з вечароў, калі маршалы адпачывалі ў заслаўскай рэзідэнцыі, размова зайшла і пра Жукава. Яны расказалі шмат цікавых фактаў, якія сведчылі пра мудрасць і празорлівасць яго палкаводчага генію. Словам, у тыя дні я падкаваўся грунтоўна. Дзякуй Богу, што ўсё пачутае я пасля старанна занатаваў, яшчэ, праўда, нічога не маючы на ўвазе. Проста так, на ўсякі выпадак.

Калі нарэшце я цвёрда вырашыў, што буду пісаць пра Жукава, стаў паглыбляцца ў тэму — перачытаў процьму спецыяльнай літаратуры, не адзін дзень праседзеў у розных архівах, сустрэўся з дзясяткамі франтавікоў. Асабліва каштоўнай для мяне была сустрэча і грунтоўная размова з асабістым шафёрам Георгія Канстанцінавіча Аляксандрам Бучыным.

**— Я ўважліва і з вялікай цікавасцю чытаў вашу кнігу. У ёй вы сапраўды многія рэчы расставілі па сваіх месцах. І ўсё ж на адно пытанне я адказу не знайшоў, а яно цяпер узмоцнена мусіруецца ў пэўных колах.**

— Вы, мабыць, маеце на ўвазе пачатак вайны?

**— Так. Чаму мы ўсё ж пацярпелі ў першыя дні вайны такое сакрушальнае паражэнне? І чаму вінаватым аказаўся адзін камандуючы Заходнім фронтам Паўлаў? Ці няма тут пэўнай віны і Жукава як начальніка Генеральнага штаба Чырвонай Арміі?**

— Віна Паўлава ў той катастрофе, якую мы перажылі на пачатку вайны, відавочная і несумненная. Чуйкоў расказваў, што ў сакавіку 1941-га ён, будучы камандуючым 4-й арміяй, штаб якой у той час базіраваўся ў Кобрыне, на ваенным савеце акругі ўзняў пытанне аб тым, каб з улікам складаных і напружаных абставін на германа-савецкай граніцы вывесці з Брэсцкай крэпасці дзве дывізіі ў летнія лагеры.

«Ты што? — накінуўся на яго Паўлаў. — Немцы ж адразу ўсё засякуць. Раз мы выводзім войскі, значыць, рыхтуемся да вайны. Ты што, правакацыю хочаш учыніць? Ды за такія рэчы...» Словам, Чуйкову дарма гэта не абышлося: неўзабаве яго адхілілі ад камандавання арміяй і накіравалі ў Кітай саветнікам.

Альбо другі факт, сведкам якога быў генерал Капец, у той час камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі Беларускай ваеннай акругі. Паветраная разведка сведчыла, што да нашых граніц сцягваюцца вялікія танкавыя групоўкі. Пра гэта далажылі Паўлаву. Той раздражнёна выслухаў і з'едліва папракнуў: «Панікёры! А вы ад страху не абапісаліся?»

Больш за тое, калі літаральна за чатыры дні да пачатку вайны Паўлаву пазваніў Сталін і запытаўся, як сітуацыя, паколькі ёсць даныя, што немцы сцягваюць свае войскі да нашых граніц, той запэўніў, што ніякіх груповак няма. Гэта ўсё правакацыйныя плёткі. Не дзіўна, што савецкія войскі на Заходнім фронце сустрэлі нападзенне фашыстаў кепска падрыхтаванымі. Ды і сам камандуючы для вядзення такіх маштабных аперацый неабходнага вопыту не меў.

Не, я не скажу, што Жукаў бязгрэшны. Памылкі былі. Але памылка памылцы — розніца. Пралікаў, якія б ракавым чынам паўплывалі на ход баявых дзеянняў, я, напрыклад, не ведаю. А вось паспяховых, пераможных аперацый на яго рахунку мноства.

## «МНЕ ШАНЦАВАЛА НА ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ...»

**— Анатоль Канстанцінавіч, вам можна шчыра пазайздросціць: вы сустракаліся з многімі вялікімі людзьмі, з некаторымі з іх сябравалі. Пра мемуары не думалі?**

— Не, пакуль не думаў. Хаця, вядома, расказаць ёсць аб чым. Мне ў жыцці шанцавала на добрых людзей. Ужо на самым пачатку сваёй ваеннай кар'еры я трапіў нампалітам да цудоўнага чалавека, выдатнага камандзіра, палкоўніка Сакалова. Полк, у які мы былі прызначаны амаль адначасова, трапіў у няміласць да вышэйшага камандавання: у ім здарыліся дзве авіякатастрофы. Дык вось, першае, што заявіў Сакалоў, прыняўшы камандаванне палком, «больш тут катастроф не будзе». Вось чаму за станам самалётаў, розная наземная тэхнікі Сакалоў сачыў прыдзірліва і строга. Але яшчэ больш прыдзірліва ён ставіўся да падрыхтоўкі лётнага саставу. Ніводзін пілот не мог быць дапушчаны да палётаў, калі выяўлялася хоць бы самая дробная загана. Вучыўся я ў Сакалова не толькі лётнаму майстэрству, але і ўменню працаваць з людзьмі, быць сабраным і валявым у экстрэмальных сітуацыях. Гэта быў мой сапраўдны Настаўнік.

І другая яркая асоба, з якой мне пашчаслівілася судакрануцца і якая пакінула свой след у маім жыцці — гэта Аляксандр Іванавіч Пакрышкін. Праслаўлены паветраны ас, тройчы Герой Савецкага Саюза. У нашу дывізію, дзе я быў начальнікам палітаддзела, ён як намеснік камандуючага войскамі ПВА прыехаў з праверкай.

Я вырашыў звярнуцца да Пакрышкіна з просьбай:

— Аляксандр Іванавіч, зайдзіце на хвілінку ў нашу школу.

— Ніякіх школ! — запратэставаў камандуючы арміяй, двойчы Герой Савецкага Саюза Гулаеў. — Мы і так спазняемся.

— Пачакай, Коля, — мякка звярнуўся да яго Пакрышкін. — Давай усё ж на хвілінку завітаем.

Зайшлі. Уваходныя дзверы вісяць на адным завесе. У класах холадна, хлопцы і дзяўчаты сядзяць у куртках. Пакрышкін дапытліва паглядзеў на мяне. Давялося патлумачыць, што на рамонт няма грошай. Аляксандр Іванавіч незадаволена пакруціў галавою, а пасля сказаў:

— Вось што, камісар. Скажы дырэктару школы, каб напісаў пісьмо на імя глаўкама, а я пісьмо перахаплю і далажу яму асабіста.

Усё так і зрабілі. І школу праз год пабудавалі новую.

**— Анатоль Канстанцінавіч, а ці праўда, што вы бралі інтэрв'ю ў Юрыя Гагарына?**

— Была такая справа. Я тады вучыўся ў Ваенна-палітычнай акадэміі. І вось у адзін з дзён рэдактар нашай шматтыражкі Усевалад Карамышаў дае мне заданне ўзяць інтэрв'ю ў Гагарына. Ён вечарам будзе выступаць у Цэнтральным доме Савецкай Арміі. І ўручае мне запрашэнне. Прыйшоў я ў ЦДСА за дзве гадзіны да пачатку сустрэчы. Хаджу па розных кабінетах, спрабую дамовіцца, каб памаглі сустрэцца з Гагарыным — ніхто нічога не абяцае. І тут ідзе мне насустрач знаёмы маёр, з якім мы разам здавалі ўступныя экзамены ў акадэмію. І я ўспомніў, што ён якраз працуе ў ЦДСА. Расказваю яму пра сваю праблему.



Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Прыйшлі ў рэстаран.

— Вунь столік накрыты, — паказвае налева ў кут. — Гэта для Гагарына. Садзіся па суседстве і чакай. Калі цябе кадэбісты не вытураць — усё будзе ў парадку.

Сядзеў хвілін сорак. Двое ў цывільным некалькі разоў падазрона паглядвалі на мяне, але не чапалі. І раптам з'уляецца Гагарын. Я імкліва падняўся яму насустрач.

— Таварыш маёр, дазвольце прадставіцца: маёр Сульянаў!

Гагарын нават крыху сумеўся:

— А ты чаго тут?

— Атрымаў заданне ўзяць у вас інтэрв'ю.

— Дык мне ж трэба перакусіць.

— Вы ешце, а я вам буду задаваць пытанні. Іх у мяне не шмат.

— Добра. Валяй!

Такім ён мне і запомніўся, Юрый Аляксеевіч Гагарын — просты, абаяльны хлопец, без усялякай позы і арэолу велічнасці. Хаця яго ўжо ведаў увесь свет.

**— А з вядомых дзеячаў мастацтва вам даводзілася з кім-небудзь сустракацца?**

— Безумоўна. Вось, напрыклад, народны артыст СССР Яўген Мацвееў. Я з ім сустракаўся два дні запар. У нас у Мінску, на Заслаўскім вадасховішчы, здымаўся фільм «Емяльян Пугачоў». У галоўнай ролі — Мацвееў. Здымалі эпізод, калі рускія войскі акружылі Пугачова і ён выходзіць з чаратоў з узнятымі рукамі. А дзень выдаўся халодны. Сонца няма. Спатрэбіўся дубль. Лезці немаладому ўжо чалавеку ў ледзяную ваду яшчэ раз і стаяць там па пояс — значыць рызыкаваць здароўем. Трэба было нешта прыдумаць. Выручылі мы, ваенныя. Прывезлі спецыяльны касцюм супрацьхімічнай абароны. Ён лёгкі і ваду не прапускае. Мацвееў апрануў яго, наверх кажушок — і ў возера. Аднак холадна ўсё роўна. Калі эпізод знялі, мы бачым, што ў артыста зуб на зуб не трапляе. Вырашылі сагрэць яго народным, правераным спосабам: налілі паўшклянкі гарэлкі. Якім жа цікавым апавядальнікам аказаўся Яўген Сямёнавіч! Ён жа таксама хацеў быць лётчыкам у свой час. Але яго накіравалі на курсы пяхотных камандзіраў. А пасля і наогул лёс павярнуўся ў іншы бок. І дзякаваць Богу. Яшчэ невядома, які з яго выйшаў бы камандзір, а вось артыст атрымаўся выдатны.

З народнай артысткай СССР Віяй Артманэ я пазнаёміўся ў Ленінградзе. Дарэчы, на здымках усё таго ж «Емяльяна Пугачова». Я прыйшоў на здымачную пляцоўку, спадзеючыся, што там будзе Яўген Мацвееў. Але яго не аказалася. Салтыкоў пазнаёміў мяне з Артманэ, якая выконвала ролю Кацярыны II. Вечарам пайшлі ў рэстаран — Аляксей Салтыкоў, Пётр Глебаў, Вія Артманэ і я. Але здарылася непрадбачанае: да нас, у кампанію, прываліла яшчэ чалавек пяць, незапрошаных. Артманэ гэта абурыла: «Якое хамства!» І пакінула нас. Пасля рэстарана я ўзяў пляшку каньяку, закуску і пайшоў да яе ў нумар. Аднак яе дачка катэгарычна заявіла, што яна хоча глядзець тэлевізар і мы сваімі размовамі будзем ёй перашкаджаць. Нам нічога не заставалася, як пайсці ў нумар да мяне. І мы прасядзелі да дзвюх гадзін ночы. Артманэ ўразіла мяне сваёй эрудыцыяй. А назаўтра, калі мы пайшлі ў Эрмітаж, яна праявіла незвычайныя веды па гісторыі, ювелірных упрыгажэннях і іншых рэчах. На жаль, у гэтага знаёмства працягу не адбылося.

## І ЖЫЦЦЁ, І ПРАЦА, І ЗАХАПЛЕННЕ...

**— Вы аднойчы сказалі, што кніга для вас — гэта і жыццё, і праца, і захапленне...**

— Я дадаў бы яшчэ: і мая пастаянная, нязменная любоў. Гэтую любоў мне яшчэ ў раннім дзяцінстве прывіў бацька. Спачатку розныя казкі, прыгодніцкія аповесці чытаў мне ён, а пасля, калі я ўжо стаў школьнікам, чытаў самастойна. Бібліятэка ў нашай школе была невялікая, але дапамог выпадак. Школьны юнацкі гурток за свае дасягненні трапіў на ўсесаюзную выставу і быў удастоены прэміі — бібліятэкі ў тры тысячы тамоў. Вось ужо дзе быў прастор для маёй душы! Я тырчаў каля гэтых кніг дзень і ноч. Нават калі даводзілася пасвіць кароў, я што-небудзь пачытаць браў з сабою. Без перабольшання магу сказаць, што з кнігаю я не расставаўся нідзе і ніколі.

**— А любімыя кнігі, любімыя літаратурныя героі ў вас ёсць?**

— Мая першая любоў — Паўка Карчагін. Пад яго ўздзеяннем фарміраваўся мой юнацкі свет, выпрацоўваліся першыя навыкі сілы волі, мужнасці. Ды хіба толькі мой? Усё наша пакаленне можна назваць карчагінцамі. У пасляваенныя гады такім жа ўсеагульным кумірам быў Аляксей Мярэсьеў з «Аповесці пра сапраўднага чалавека». Кім ён быў для нас, лётчыкаў, я нават сказаць не магу. Грыгорый Мелехаў з шолахаўскага «Ціхага Дона» вучыў мяне іншым, але не менш важным рэчам — цаніць шчырасць і вернасць у каханні, быць патрыётам бацькоўскай зямлі, не дзяліць свет на чорнае і белае, таму што ў ім ёсць мноства іншых фарбаў. Крыху пазней увайшлі ў маё жыццё героі кніг Дастаеўскага, Талстога, Тургенева. Глыбокія філасофскія праблемы, складанейшыя агульначалавечыя праблемы, над якімі яны біліся, пакутавалі, станавіліся часткаю і маіх напружаных разважанняў. Да любімых кніжак я вяртаюся пастаянна. Перачытваю для падзарадкі хаця б старонак пяцьшэсць. Адна з такіх кніг, што заўсёды ў мяне пад рукой, — «Капітанская дачка» Пушкіна. Да яе я ўжо звяртаюся як пісьменнік, памятаючы высокую ацэнку Л.М. Талстога: «Вось як трэба пісаць!»

**— Анатоль Канстанцінавіч, я разумею: вы — рускі і цікавіцеся перш за ўсё рускай літаратурай. Але, разам з тым, ужо не адзін год жывяце ў Беларусі і, напэўна, добра ведаеце і беларускую літаратуру.**

— Многіх аўтараў не толькі ведаю, але і люблю. Пра Васіля Быкава я ўжо гаварыў. Люблю чытаць і перачытваць Івана Шамякіна, з якім у мяне таксама былі блізкія, сяброўскія адносіны. Паланёны цудоўнымі раманамі Івана Мележа. Мне здаецца, ніхто з нашых пісьменнікаў так ярка і так поўна не раскрыў душу беларуса-палешука, як ён. А што тычыцца гістарычнай прозы, то тут няма роўных Уладзіміру Караткевічу.

**— Вось мы ўсё аб прозе ды аб прозе. А ці ёсць у вашай душы месца паэзіі?**

— Ёсць, і немалое. Сам я, праўда, вершаў не пісаў, але паэзію вельмі люблю. Калісьці, паўтаруся, я мог на памяць чытаць некаторыя паэмы А.С. Пушкіна. І сёння помню цэлыя раздзелы з паэмы Твардоўскага «Васіль Цёркін». З беларускіх аўтараў вельмі люблю Максіма Танка. Яго зямная, па-народнаму вобразная і мудрая паэзія не можа не хваляваць, не сагравацъ чалавечую душу. Падабаецца глыбокая, філасофская лірыка Пімена Панчанкі. З ім мы, дарэчы, жылі ў адным пад'ездзе і не раз бавілі вечары за сяброўскім сталом. Многа ў свой час сустракаўся з Генадзем Бураўкіным. Калі ён узначальваў Дзяржтэлерадыё, я па яго запрашэнні нават вёў на тэлебачанні перадачу пра армейскія будні. Генадзь Мікалаевіч — паэт Божай міласці.

## АПТЫМІЗМ — УЛАСЦІВАСЦЬ ДУШЭЎНАГА ЗДАРОЎЯ

**— Анатоль Канстанцінавіч, азіраючыся на пройдзены жыццёвы шлях, як бы вы маглі яго ахарактарызаваць? Ці быў ён для вас прамым, лёгкім, бясхмарным?**

— Прамым, бадай, быў. Хмар у маім жыцці хапала. І ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Здаралася, трапляў у цяжкія пераплёты. Аднойчы быў падняты ноччу па баявой трывозе. Неабходна было выявіць паветранага парушальніка. Намацаўшы цэль, я захапіўся пагоняй і забыўся на паказанні прыбораў. Спахапіўся, калі паліва было ўжо на зыходзе. А я над вялікай акваторыяй. Паведаміў на камандны пункт аб тэрміновым вяртанні. Цудам дацягнуў да аэрадрома, і ледзь колы дакрануліся пасадачнай паласы — рухавік заціх. Калі тэхнікі падбеглі да самалёта, я ўсё яшчэ сядзеў у кабіне, выціраючы халодны пот.

**— А ўвогуле, у чалавеку што вы цэніце больш за ўсё?**

— Прыстойнасць. І яшчэ — абавязковасць. Складана мець справу з чалавекам, які не трымае свайго слова.

**— Што ж, трэба прызнаць, дабіліся вы многага. Атрымалі высокае званне генерала. Займалі ў армейскай іерархіі салідныя пасады. Сталі пісьменнікам, кнігі якога выдаюцца вялікімі тыражамі і чытаюцца на ўсёй постсавецкай прасторы. Ушанаваны многімі літаратурнымі прэміямі і дзяржаўнымі ўзнагародамі. Прызнайцеся, вы лічыце сябе шчаслівым чалавекам?**

— Безумоўна.

**— А таго, што я пералічыў — кар'ера, слава, — дастаткова для шчасця?**

— Не, недастаткова. Любімая праца, прызнанне — рэчы, безумоўна, важныя. Але для поўнага шчасця патрэбны і другі бок жыцця — асабісты. Я маю на ўвазе добрую, моцную сям'ю. У мяне ў гэтым плане поўны парадак. З жонкай пашанцавала. Таісія Іванаўна — інтэлігентны, вельмі прыстойны чалавек, цудоўная маці. Ажаніліся мы па каханні і вось паўвека ўжо жывём разам. Выхавалі дваіх дзяцей, у нас трое ўнукаў.

**— Анатоль Канстанцінавіч, над чым працуеце сёння?**

— Як і кожны творчы чалавек, я прымхлівы, таму не люблю гаварыць пра свае планы. Скажу толькі, што гэта будзе дакументальная рэч. Я ўсё больш і больш схіляюся да такога роду літаратуры.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

---

■ Дзённік настаўніка



## ПРАБЛЕМЫ «ПЕРАХОДУ» ДА ДАРОСЛАСЦІ

Усе мы, дарослыя, калісьці былі дзецьмі. І ўсе дзеці з цягам часу абавязкова стануць дарослымі (за выключэннем, бадай што, казачнага Пітэра Пэна). Але паміж дзяцінствам і дарослым жыццём ёсць адзін цікавы перыяд. Ужо не дзеці, яшчэ не дарослыя... Хто ж яны, гэтыя падлеткі пераходнага ўзросту?

Вельмі праблемнага ўзросту як для іх саміх, так і для бацькоў...

Пераходны ўзрост уласных дзяцей для бацькоў чамусьці заўсёды вялікая нечаканасць. Здаецца, зусім нядаўна з радзільні прывезлі... Здаецца, яшчэ ўчора былі сын ці дачка такімі па-дзіцячаму шчырымі і даверлівымі; усё, што трэба і не трэба, бацькам расказвалі...

І раптам нешта змянілася...

Пра свае школьныя (і наогул, асабістыя) справы — ні слоўца! А паспрабуеш аб чымсьці такім дапытацца — рэзка, са злосцю нават могуць абарваць на паўслове. Маўляў, гэта мае справы, і не трэба ў іх без спецыяльнага дазволу ўлазіць!

Вядома ж, бацькам крыўдна. Бо яны, што ні кажы, усё яшчэ нясуць поўную адказнасць за сваіх дзяцей, кормяць іх, апранаюць, хвалююцца за іх, урэшце... А няўдзячныя дзеці гэтага ніяк зразумець не жадаюць! Дарослымі яны сябе ўявілі... Ці не ранавата?!

Ну чым не прычына для канфлікту?!

Бацькі па-ранейшаму працягваюць лічыць сваіх дзетак маленькімі і безабароннымі, за якімі вока ды вока патрэбна, а падлеткі ўпарта жадаюць быць дарослымі. Дакладней, хочуць, каб бацькі лічылі іх дарослымі і цалкам самастойнымі ў сваіх учынках...

Што тут можна параіць бацькам?

Па-першае, без крыўды і злосці паспрабаваць проста зразумець падлетка, нават калі ён упарта не хоча разумець вас. Бо яму і так няпроста ў гэты перыяд... Змяняецца не толькі псіхалогія маладога чалавека. У арганізме ідзе поўная фізіялагічная перабудова, канчаткова фарміруюцца ўсе «дарослыя» сістэмы, адбываецца ўзмоцнены выкід гармонаў, узнікаюць так званыя хваробы пераходнага ўзросту, з'яўляюцца прышчы і вугры. Яны паступова пройдуць, але колькі перажыванняў і хваляванняў (асабліва ў дзяўчатак) выклікаюць гэтыя амаль абавязковыя «прыкметы» пераходнага ўзросту! А яшчэ падлеткаў у гэты час могуць турбаваць і больш сур'ёзныя, хваравітыя нават адчуванні, выкліканыя тым, што многія органы проста не паспяваюць за імклівым ростам свайго гаспадара. Потым яны «нагоняць» сваё, усё прыйдзе ў норму, але гэта будзе потым...

А пакуль што падлетак можа адчуць сябе безнадзейна хворым, фізічна непаўнацэнным. І нават паверыць у гэта! Бо менавіта нервовай сістэме асабліва цяжка ў няпросты пераходны перыяд. Адсюль і замкнутасць падлеткаў, іх раздражняльнасць і нават агрэсіўнасць у адказ на, здавалася б, самыя найлепшыя памкненні з боку бацькоў.

І як вынік — зваротная раздражняльнасць з боку бацькоў. Як жа няпроста змірыцца з тым фактам, што іх аўтарытэт для маленькіх дзяцей і для падлеткаў — гэта далёка не адно і тое ж. І што тыя метады, якімі кіраваліся яны пры выхаванні сына альбо дачкі ў мінулыя гады, ужо, на жаль, не працуюць. Трэба штосьці пераглядаць ва ўзаемаадносінах з уласнымі дзецьмі, а змяняць размераны і такі звычны распарадак не вельмі і хочацца...

Не хочацца, а прыйдзецца. І наогул, парадаксальная складваецца сітуацыя. З аднаго боку, падлеткі ўпарта імкнуцца да поўнай незалежнасці ад бацькоў, з другога ж — у няпросты гэты перыяд ім так патрэбны менавіта бацькоўская падтрымка і разуменне. Але тактоўныя, асцярожныя...

Ранейшым аўтарытэтам бацькі для падлеткаў ужо карыстацца не будуць, і з гэтым рана ці позна, але давядзецца ўсё ж змірыцца. І вельмі важна пастарацца зрабіць так, каб вы і вашы дзеці і ў далейшым засталіся паміж сабой у даверлівых, сяброўскіх нават адносінах. А для гэтага...

Для пачатку хаця б выдзеліце падлетку ў доме альбо кватэры ўласнае месца: калі і не пакой, дык хоць асабісты куточак са сталом, тумбачкай... І зрабіце ўсё, каб ён адчуваў сябе на гэтай тэрыторыі поўным гаспадаром, і быў упэўнены, што вы (у час яго адсутнасці) ніколі не будзеце «парушаць межы» гэтай запаведнай тэрыторыі... І не парушайце іх, нават калі вам вельмі гэтага хочацца.

А яшчэ часцей размаўляйце са сваімі дзецьмі-падлеткамі. Але гутаркі гэтыя не павінны змяшчаць у сябе нейкія павучанні, тым больш, папрокі. Ды і тон іх з боку бацькоў не павінен гучаць паблажліва альбо насмешліва (менавіта падлеткі на гэта вельмі востра рэагуюць). Гутарце, як роўныя з роўнымі. І не саромейцеся самі выслухоўваць парады з боку ўласных дзяцей, асабліва ў тым, у чым яны лепш за вас разбіраюцца (у інтэрнэт-тэхналогіях, напрыклад). І тады, будзьце ўпэўнены, дзеці таксама самі ўздымуць праблемныя пытанні, якія іх хвалююць і на якія вы зможаце даць ім вычарпальны адказ.

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

---

■ Конкурс

## ДЗІЦЯЧЫ ПОГЛЯД НА ГАНДАЛЬ

**Міністэрства гандлю напярэдадні Дня работнікаў гэтай галіны, які адзначаецца ў апошнюю нядзелю ліпеня, і святкавання свайго 90-годдзя, абвясціла конкурс на лепшы дзіцячы малюнак. Тэма конкурсу — «Гандаль. Погляд дзяцей».**

Пераможцы будуць вызначаны рэдакцыйным саветам часопіса «Гермес» у трох узроставых катэгорыях: да 6 гадоў, ад 6 да 10, ад 10 да 16 гадоў. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца работы на вышэйназваную тэму, якія паступяць у Міністэрства гандлю да 1 верасня па пошце (220030, г. Мінск, вул. Кірава, 8, корп. 1) або па адрасе mail@mintorg.by з пазнакай «Малюнак на конкурс» з абавязковым указаннем свайго адраса і кантактнага тэлефона для сувязі. Дзевяць лепшых малюнкаў (па тры ў кожнай узроставай катэгорыі) будуць размешчаны на сайце Міністэрства гандлю, а таксама ў галіновым часопісе «Гермес» да 1 лістапада гэтага года. Пераможцам конкурсу ва ўрачыстых абставінах будуць уручаны памятныя падарункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Ведай нашых!

# Балетная сцэна як поле бітвы: ёсць перамогі і медалі

## Гран-пры конкурсу артыстаў балета ў Стамбуле — у беларускіх танцоўшчыкаў!

**Яго здабылі ў напружаным змаганні на сцэне падчас IV Міжнароднага конкурсу артыстаў балета ў Стамбуле артысты Вялікага тэатра Беларусі Людміла Хітрова і Канстанцін Геронік. Што да Канстанціна, то ён загартаваны змагар, неаднойчы атрымліваў нават першыя прэміі на прэстыжных міжнародных конкурсах. У трупе Вялікага тэатра Беларусі ён з 2010 года, але ўжо з'яўляецца вядучым майстрам сцэны. Дарэчы, як і Людміла Хітрова, якая прыехала да нас у 2008 годзе з Расіі (працавала ў Краснаярску). Мінулы сезон скончыўся для абаіх на ўздыме: і Людміла, і Канстанцін за сваю плённую творчую працу былі ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.**

Поспехам нашых артыстаў на міжнародных конкурсах ганарыцца і кіраўніцтва тэатра. Яшчэ б: у Стамбуле наогул беларускім артыстам спрыяла ўдача. Таму што ў нас яшчэ і Першая прэмія — яе заваяваў саліст беларускага балета Такатошы Мачыяма. Другую прэмію ўзяла маладая артыстка Яна Штангей. Не, хутчэй, яны былі ўзнагароджаны за майстэрства вельмі прадстаўнічым журы на чале з кіраўніком балетнай трупы Афінскай оперы Ірэкам Мухамедавым. Акрамя таго, у складзе журы вельмі шмат паважаных асоб — у прыватнасці, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага балета Берліна Уладзімір Малахаў, Летыцыя Джуліяні, прыма-балерына балетнай трупы Рымскай оперы; Эвелін Тэры, мастацкі кіраўнік Міжнароднага балетнага конкурсу OTR у Вене, і іншыя.

Вярнуўшыся на радзіму, нашы лаўрэаты здолелі перадаць сваё натхненне дырэкцыі тэатра і кіраўніцтву балетнай трупы ў прыватнасці. Таму што народны артыст Беларусі Юрый Траян загаварыў пра мэтазгоднасць заснавання ў нашай краіне міжнароднага конкурсу артыстаў балета. Ёсць жа ў нас ужо міжнародны конкурс вакалістаў! Але і сярод артыстаў балета нямала тых, хто з задавальненнем бліснуў бы на «хатнім» конкурсе на радасць вельмі актыўнай і ўдзячнай айчыннай публіцы, улюбёнай у мастацтва харэаграфіі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**



Людміла ХІТРОВА і Канстанцін ГЕРОНІК.

■ Прэм'ера

# НУ І «ФІНТ»

## Каханне гуляе з людзьмі, як з цацкамі

**У яго — надта клапатлівая мама. У яе — строгі тата. І бацькоў трэба слухаць. Але бываюць моманты, калі кожнае дзіця (няхай яму ўжо 32 гады) пачынае разумець: трэба будаваць сваё жыццё самому і рабіць уласны выбар, з кім жыць — з мамай ці з каханай. А каханне сітуацый для развag падкідвае дастаткова.**

Выпадкова ці не? — таксама цікавае пытанне, над якім прапанавалі паразважаць напрыканцы тэатральнага сезона ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Сярэдзіна ліпеня, надвор'е цудоўнае, час для сустрэч і рамантычных спатканняў. Вось паглядзіш спектакль — і захочацца чагосьці такога, а думкі ж, кажуць, матэрыялізуюцца…

Ці ўсё-такі ёсць нехта, хто можа іх матэрыялізаваць? Напрыклад, хлопец у белым, які гойдаецца на лесвіцы і час ад часу кагосьці кудысьці штурхае ці, наадварот, камусьці падказвае, што казаць, шэпча, а людзі проста агучваюць услых яго думкі. Такі прыгожы і ідэальны, як у спектаклі «Фінт-Круазэ», які паставіла рэжысёр Святлана Навуменка, аб'яднаўшы фактычна два розныя творы. Першы — гэта п'еса Дзмітрыя Багаслаўскага «Перапіс насельніцтва», другая — «Сватаўство», створаная ў суаўтарстве Віктарам Красоўскім і Дзмітрыем Багаслаўскім. Творы розныя, але ёсць у іх нешта падобнае. Па-першае — тэма кахання. Па-другое — тое, якім чынам з намі пра яго размаўляюць: у жанры лёгкіх іранічных камедый. Трэцяе: стылістыка спектакля, які хоць і складаецца з дзвюх частак, але яны спалучаюцца ў адно цэлае праз рэжысёрскую падачу і сцэнічнае афармленне (яно не надта абцяжарвае думкі). Ну і той самы загадкавы хлопец у белым, які пераходзіць з першага ў другі. Але персанаж зусім не выпадковы: без яго героі маглі б наогул не сустрэцца, ці не спадабацца адзін другому, ці разышліся б — рассварыліся б, паслухаўшы сваіх зямных (нават вельмі прыземленых) родных.

У яго мама штораз перапытвае, ці папісаў перад выхадам. Ёй тата ўвесь час нагадвае, што галоўнае — каб ногі былі ў цяпле… Глядзіш на гэтых персанажаў, нібыта і прыдуманых, але такіх пазнавальных, — і смешна. Яны смешныя, але разумееш, што са шчырым чалавечым клопатам за блізкіх, — і ад гэтага смех не ядавіты, а добры. А калі яшчэ і сам у студэнцтве пабываў у ролі «перапісчыцы» (трэба было хадзіць па кватэрах і апытваць людзей, а яны ж сапраўды па-рознаму ставяцца да чужых), то наогул спектакль атрымліваецца рэалістычна-жыццёвым. Так — праз рэакцыю на ўбачанае і ўласныя эмоцыі — лягчэй зразумець, за што так любяць п'есы маладога беларускага аўтара Дзмітрыя Багаслаўскага ў розных гарадах і нават краінах былога СССР. Любяць — і чытаюць, друкуюць, ставяць.

Ён лаўрэат не аднаго прэстыжнага міжнароднага драматургічнага конкурсу. А на радзіме пастаноўкі яго твораў — пералічыць па пальцах. А яны, між іншым, вельмі розныя: ёсць глыбокія і нават філасофскія (як «Ціхі шэпт сыходзячых крокаў»), а ёсць тонкія, іранічныя, як сацыяльная камедыя «Перапіс насельніцтва».

Такая ж іронія прысутнічае ў спектаклі «Сватаўство»: ён «мент», які праследаваў прастытутку, але «каханне раптам надыдзе», як кажуць. Яна ж зусім не падобная на іншых «начных матылькоў» — педагог. У незвычайную і «цікавую» прафесію яе загналі абставіны, гарачая любоў да таты-навукоўца, якога звольнілі з працы. А так хацелася дапамагчы яму ўтрымацца ў жыцці, вось і пайшла на падман, грошы былі патрэбны, ну і… Бедны, бедны тата!.. Ён жа ўсё пачуў! Вядома, катастрофа. Вядома, праўда выйшла на паверхню, бо так і павінна быць. І ён усё роўна сутыкнуўся з выбарам: жыць ці не жыць. Але лёс ёсць лёс. І ёсць законы жанру: хто ж яму дазволіць павесіцца ў камедыі? Аўтары яўна не планавалі «чорную камедыю». Рэжысёр, згодна са зместам, падтрымала сцёбны падыход, без асаблівых штучных «выкрутасаў», акцёры (у дзвюх частках іграюць Дзяніс Паршын, Сяргей Шымко, Максім Брагінец, Андрэй Дабравольскі, Марына Здаранкова) трымаюць настрой, які зададзены самім тэкстам. І нарэшце — той самы загадкавы хлопец у белым нам адразу даў зразумець, што ўсё будзе добра.

Як жа можа быць інакш, калі ў людзей каханне? Усё і павінна быць добра, калі закаханыя здольныя адстойваць сваё пачуццё і не адракацца ад яго ў залежнасці ад абставін, сямейных узаемаадносін, маніпулявання і меркавання іншых, якое можа ўплываць на ўчынкі. Праўда «папісаць перад выхадам» і «ногі ў цяпле» таксама ж ніхто не адмяняе.

Дарэчы, і ў прадстаўнікоў старэйшага пакалення ўсё павінна быць добра. Хіба сваім жыццём і клопатам за дзяцей не заслужылі яны дачу з двума тэлевізарамі?

Вось такі «фінт» на закрыццё сезона. Вядома, пры аншлагу. Але і ў новым сезоне гэты спектакль, хутчэй за ўсё, будзе праходзіць пры перапоўненай зале: ён, безумоўна, глядацкі. І ён пра нас — магчымасць паглядзець на сябе збоку, прааналізаваць свае ўласныя жыццёвыя сітуацыі, кагосьці зразумець, камусьці дараваць (са смехам яно прасцей) альбо нават прадухіліць сваё перараджэнне ў падобных асоб. Спектакль пра каханне, што заўсёды і ў любым узросце хвалюе кожнага. Вось бы яшчэ пры кожнай складанай сітуацыі нябачна прысутнічаў хлопец у белым, магчыма, не было б сітуацый, калі нехта некага не так зразумеў, нехта не тое пачуў (ці наогул не пачуў, або пачуў, але не таго), і тады ўсе былі б шчаслівыя.

**Ларыса ЦІМОШЫК**



■ Кінакрокі

# АД ФАЛЬШУ ДА САПРАЎДНАГА

## За што даюць прызы на фестывалі імя Таркоўскага?

**Мы ўвесь час губляемся ў бягучым патоку павеваў, тэндэнцый, трэндаў, поглядаў, ідэй. Мы раствараемся ў тонах і дэцыбелах інфармацыі, зазіраемся на прыгожую пустэчу, купляемся на беспадстаўныя, але модныя аргументы. Мы ўбіраем прывабныя для нас гукі — але ўсё гэта складаецца ў пачварную какафонію. Бо непарушных ісцін няшмат, і кожная — на ўсе часы. Галоўнае — сям'я, вернасць, каханне і мір ва ўсім свеце. Усё астатняе — адхіленні.**



Але мы існуём сярод мастацтва, глядзім кіно, і нехта з таго боку заслоны спрабуе да нас дастукацца, нагадаць, пераканаць. Чарльз Чаплін, Віторыа дэ Сіка, браты Дардэн — ім варта верыць.

Давайце верыць і рэжысёру Ільмару Раагу, які адзначыўся ў фільме сумеснай вытворчасці Беларусі, Расіі, Фінляндыі і Эстоніі і зняў экзістэнцыяльную карціну «Я не вярнуся». Гэтая карціна з тых, што сваёй стылай рэчаіснасцю здольная вырваць нас з уласнай надуманай праўды.

Фільм ужо мае фестывальны лёс. Нью-ёркскі фестываль Tribeca, адным з заснавальнікаў якога з'яўляецца Роберт дэ Ніра, адзначыў карціну ўзнагародай «Спецыяльная згадка журы». «Я не вярнуся» атрымала таксама прыз «За прафесійныя дасягненні» на кінафестывалі імя Андрэя Таркоўскага «Люстэрка».

Сюжэт закручваецца вакол маладой выкладчыцы Ганны, у мінулым — выхаванкі дзіцячага дома. Выдатніца, маралістка, сёння — лектар па Байрану (той яшчэ хадок), палюбоўніца жанатага прафесара Андрэя. Але без негатыўнай афарбоўкі. Ганна закаханая канчаткова і незваротна і марыць пра тое, што калі-небудзь прафесар з ёю ажэніцца. Мужчына не без пачуццяў, але ад жонкі, аматаркі чырвоных ботаў і зялёнага паліто адначасова, не мае намеру сыходзіць.

Пасля несправядлівага абвінавачвання Ганны ў захоўванні наркотыкаў тая вымушана збегчы ад паліцэйскага праз акно. Прыняўшы выгляд падлетка ў кедах, куртцы-парцы і шапцы, яна трапляе ў прытулак для бяздомных дзяцей, дзе знаёміцца з задзірыстай 13-гадовай Крысцінай. Калі Аня збягае з прытулку, Крысціна накіроўваецца за ёю. З гэтага моманту карціна набывае выгляд «роўд муві» (дарожнай гісторыі). Але як ведаць, да чаго гэтая дарога прывядзе і ці варта лічыць прадвесцем урывак з лекцыі Ганны сваім студэнтам: «Яна (дарога) не прывядзе вас да шчаслівай развязкі або, вобразна кажучы, да дома…».

Адносіны паміж дзвюма галоўнымі гераінямі развіваюцца па традыцыйнай схеме: Крысціна навязвае сябе Ганне — тая спрабуе ад дзяўчынкі пазбавіцца. Аднак пасля адчувае сябе абавязанай давезці малую да бабулі ў Казахстан. За час небяспечнага падарожжа яны паступова прыціраюцца адна да другой, і Аня пачынае па-мацярынску любіць Крысціну.

**Нью-ёркскі фестываль Tribeca, адным з заснавальнікаў якога з'яўляецца Роберт дэ Ніра, адзначыў карціну ўзнагародай «Спецыяльная згадка журы».**

Адносіны з Крысцінай аказваюцца на шалі вагаў, супрацьлегласць якой — каханне Ганны да жанатага начальніка. Сувязь з Андрэем варта лічыць адпраўной кропкай, пунктам А, стартам на «дарозе», якая служыць лейтматывам у карціне, для карэннага жыццёвага пераўтварэння, змены арыенціраў і каштоўнасцяў. Можна быць упэўненым, што яно адбудзецца.

Крысціна са сваёй кранальнай непасрэднасцю, верай у добрае жыццё, накіраванасцю да бабулі закранае жаночыя струны ў Ганне: мацярынства, клопат, жаданне стварыць сям'ю.

Падчас развіцця адносін з Крысцінай паказваецца і лінія сувязі з палюбоўнікам. Для гэтага падрыхтавана добрая глеба. Прафесар трапляе ў двухсэнсоўную сітуацыю: ён жанаты, але кахае Ганну. Ён хоча праводзіць з Ганнай час, але яе абвінавачваюць у захоўванні наркотыкаў. Любімы чалавек просіць аб дапамозе, але Андрэй не знаходзіць магчымасці і жадання дапамагчы ёй. Таму замест слушнай дапамогі толькі словы, такія ж пустыя, як і яго «каханне».

Складанае становішча Ані стала для яе праверкай на трываласць. Крысціна ж у гэты час становіцца для яе сапраўды блізкім чалавекам. Але да таго часу, пакуль не ўзнікае экзістэнцыяльная «памежная сітуацыя»: пасля сваркі Крысціна садзіцца ў машыну, якая нібыта трапляе ў аўтакатастрофу.

Добры момант для галоўнай гераіні ўсвядоміць, што важней: выпадковая дзяўчынка ці мужчына, якога яна даўно кахае, прычым кахае моцна і безнадзейна…

Карціну прасякваюць невытлумачальная рэжысёрская любоў і духоўнасць. «Я не вярнуся» — не проста выверааная ў дэталях, колерах, пейзажах і дробязях творчая адзінка. Гэта карціна, да якой аўтар падышоў з асабістай цікавасцю і з душой (хоць гэта можа ўспрымацца як банальнасць).

Персанажы фільма «Я не вярнуся» абмаляваны старанна і з любоўю. Сумны твар Ганны і непасрэднасць Крысціны зачароўваюць, а шматлікія дробязі, якія спалучаюцца з агульнай канвой, дапаўняюць вобразы наўмысна кранальна і дэталёва.

Гэтыя «гаплікі», якія расстаўлены на працягу ўсяго фільма, умела ўздзейнічаюць на пачуцці гледача. Кранальныя паводзіны Крысціны, яе рэзкія рухі самотнага чалавека, якому варожы цэлы свет, і ў той жа час яна па-дзіцячы непасрэдная. Яе самае патаемнае захоўваецца ў бляшанай скрыначцы: паношанае фота, на якім паказана Крысціна з мамай і бабуляй, цацачкі, пацеры.

Аня ж — вобраз самаадданай закаханай жанчыны, цярплівай і паслухмянай. Дарога, якая яе зацягнула, дзяўчынка, якая настойліва патрабуе настолькі ж моцнай любові, падштурхнуць Аню да таго, каб адвярнуцца ад гарачага, але фальшывага пачуцця.

Натхняе эпізод, у якім вандроўніцы дзеляцца сваімі марамі: Ганна хоча чырвоныя боты (што звязана з прафесарам), а Крысціна — кілаграм цукерак. «Давай кілаграм цукерак купім. Цэлы кілаграм цукерак — гэта ж крута». Шчырасць мае працяг. Аднойчы Крыс з бессаромнай усмешкай падае сваёй спадарожніцы чырвоныя гумовыя боты, а Ганна, у сваю чаргу, у шчырым парыве крадзе для дзяўчынкі кілаграм цукерак. Змена каштоўнасцяў адбылася. Трывога не знікла.

Дарога, аднак, не скончана, і пытанне аб тым, што ж чакае герояў напрыканцы, застаецца адкрытым. Фільм пакідае пытанне ў паветры: вырашайце, маўляў, самі, якая любоў важней. Тут на фоне ўсходу час сказаць: «Я не вярнуся» — і канчаткова вызначыць свой выбар. Трактаваць можна на інтуітыўным узроўні або агучыць думку пра тое, што даваряць фальшыўкам, якія здраджваюць сваёй жонцы, не варта. Можна сказаць, што шлюб і моцныя сямейныя сувязі — натуральна, а ўсё іншае — дурнота. А можна, што каханне здольнае заплюшчыць вочы, а для прасвятлення трэба моцнае ўзрушэнне.

Сацыяльны аспект карціны бясспрэчны. Дзве дзяўчынкі з дзіцячага дома. Два персанажы фільма, у якіх глядач улюбіцца, нягледзячы на ўсю фактычную безгрунтоўнасць: у рэальным жыцці ярлыкі «сірата» і «дзіцячы дом» успрымаюцца стэрэатыпна. У нашых жа персанажах каханне, духоўнасць, адчувальнасць выяўляюцца наўмысна проста.

Акрамя багатай і тонкай сэнсавай нагрузкі, варта адзначыць добрую працу з кадрам. Рэжысёр не пакідае ўбаку магчымасці папрацаваць з выявамі прыроды ў «роўд муві». Падыход Ільмара Раага да кадра — падыход эстэта, аператарская праца — дастойная «агранка» для шчымлівай гісторыі. Прыгожыя кадры разам з музыкай кампазітара Пану Аалці, сацыяльная тэма і чарговая спроба чалавечага самапазнання — вартае спалучэнне.

Чаму ж, калі ёсць такія рэжысёры як Ільмар Рааг, якія нагадваюць нам аб галоўным, спрадвечным, сапраўдным, адзіна правільным, — мы нязменна пра ўсё патаемнае забываемся?

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Пасляслоўе

**У мастацкай галерэі горада Бярозы адкрылася выстава карцін удзельнікаў пленэру, які праходзіў летась у аграсядзібе «Шчодры заяц», што на Бярозаўшчыне. На працягу дзесяці дзён, натхняючыся бярозаўскімі (і не толькі) краявідамі, у ім бралі ўдзел мастакі з розных рэгіёнаў Беларусі і, што адметна, розных пакаленняў і творчага ўзроўню.**



Фота Надзеі БУЖАН.

# СЮЖЭТЫ, НАВЕЯНЫЯ ЖЫЦЦЁМ

## «Звязда» даведалася, што натхняе мастакоў у беларускіх краявідах

Так, Міншчыну прадстаўлялі сябры Беларускага саюза мастакоў Мікола Купава і Алесь Шатэрнік і маладая мастачка Паўла Кароткая. У радах бярозаўскіх творцаў — Анатоль Маразюк, Таццяна Зданевіч і Васіль Мастыка. Былі таксама Таццяна Каландырэц з Барысава і Ганна Бахур з Івацэвічаў.

— Не ўсе мастакі, што прынялі ўдзел у пленэры, прафесіяналы. І адной з задач было паказаць ім, што такое сапраўднае мастацтва, — адзначыў падчас адкрыцця выставы **Мікола КУПАВА.**

— Ідэя правядзення пленэру нарадзжалася доўгімі зімовымі вечарамі, — распавяла «Звяздзе» **гаспадыня аграсядзібы «Шчодры заяц» Марыя ЗАЙЦАВА.** — Доўга рыхтаваліся, выбіралі пару года. Мастакі жылі на сядзібе, малявалі наваколле. Таксама была магчымасць павазіць іх па больш аддаленых мясцінах.

На выставе прадстаўлены самыя разнастайныя пейзажы — ад безназоўных куточкаў прыроды да шырока вядомых кляштара картузіянаў, палаца Сапегаў у Ружанах і нават Навагрудскага замка. Прыцягвае ўвагу работа Анатоля Маразюка, дзе над руінамі картузіянскага кляштара мастак намаляваў людзей у вобразе свіней. Сімвалічна і красамоўна, калі ўжывую ўбачыць тое, як засмецілі тэрыторыю манастыра.

— З цягам часу, калі прыязджаеш у родныя мясціны, заўважаеш, што адлегласці становяцца карацейшымі, чым падаваліся ў дзяцінстве. Усё гэта ўспрымаеш як спадчыну і хочаш неяк яе занатаваць, таму што мы пойдзем у лепшы свет, а яна застанецца, і застанецца ў такім выглядзе, як на гэтых карцінах. А заўтра ўжо яна будзе іншай, — задуменна канстатавала **адна з аўтараў ідэі і куратар выставы Алена АЎТУШКА.**

Адна з тэм экспазіцыі — купальская — узнікла, калі можна так сказаць, незапланавана. Правядзенне пленэру якраз выпала на час, калі адзначаюць старажытнае язычніцкае свята, і пасля гэтага з'явіліся дзве карціны. Напісаныя ў адным і тым жа месцы двума рознымі мастакамі — Міколам Купавам і Анатолем Маразюком, палотны — яскравае сведчанне таго, наколькі па-рознаму кожны творца можа бачыць адну і тую ж з'яву.

Адметна, што адна з удзельнікаў пленэру — Ганна Бахур — ад нараджэння мае інваліднасць. Вольны час яна прысвячае маляванню, піша выключна прыроду. На адкрыццё выставы Ганна прыехаць не змагла, тым не менш і яе імя не абдзялілі належнай увагай.

— Калі ўбачыш яе прамяністыя вочы, пагутарыш з ёй, пачынаеш захапляцца, і нават думаеш не пра тое, што ты можаш ёй дапамагчы, а пра тое, што яна дапамагае табе. Такі пазітыўны чалавек! — зазначыла Марыя Зайцава.

— Мы працавалі з вялікім натхненнем, — падсумаваў Мікола Купава. Згодна з міжнароднымі нормамі, тым, хто прымаў пленэр, мастакі дораць па два свае творы. Так што некаторыя прадстаўленыя тут работы неўзабаве больш нельга будзе ўбачыць нідзе, акрамя сядзібы.

Варта адзначыць, што часткова выстава ўжо была прадстаўлена ў Бярозе і Мінску. Але тады яна была яшчэ зусім «сырая», а цяпер, да канца завершаная, яна вярнулася ў край, дзе і нарадзілася. Тут, у старажытных мурах галерэі мастацтваў, яе можна будзе ўбачыць ажно да 1 верасня.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК,**
*г. Бяроза*

Гао МАН:

# «ТРЫ СОНЦЫ — У СЭРЦЫ МАІМ…»

## 88-ГАДОВЫ ПЕРАКЛАДЧЫК І МАСТАК-КАЛІГРАФ З КІТАЯ ГАО МАН БОЛЬШ ЗА ПАЎСТАГОДДЗЯ ЦІКАВІЦЦА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ І КУЛЬТУРАЙ

**Гао Ман (як літаратар і мастак ён вядомы яшчэ пад прозвішчам У Ланьхань) яшчэ ў сярэдзіне 1950-х гадоў пазнаёміўся з беларускім паэтам Максімам Танкам. І тады пераклаў — разам з Гэ Баоцянем — кнігу выбраных твораў майстра беларускай паэзіі. Дзякуючы ўвазе Гао Мана да нашай літаратуры па-кітайску загучалі творы не толькі Максіма Танка, але і Святланы Алексіевіч, беларускія народныя казкі. Днямі перакладчык і мастак з Паднябеснай адказаў на пытанні журналіста «Звязды».**



**— Вы па-ранейшаму сочыце за беларускай літаратурай?**

— Сказаць, што я ўважлівы да таго, што адбываецца ў літаратурным працэсе ў вашай краіне, мне не выпадае. Ужо не той узрост, калі на ўсё хапае часу. Ды і ўвогуле не тое здароўе… Мне добра вядомыя імёны і творчасць Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Святланы Алексіевіч. У свой час я вучыўся ў Харбіне, быў добра знаёмы з моладдзю, якая размаўляла па-руску. Чуў пра публіцыста, празаіка Усевалада Іванова, які таксама ў 1930-я гады жыў і працаваў у Харбіне. У пазнейшы час чытаў яго кнігі. І толькі зусім нядаўна даведаўся пра тое, што ён з'яўляецца ўраджэнцам Беларусі, Ваўкавыска.



Такім кітайскі мастак уяўляе Васіля Быкава...

**— А наколькі вам вядома беларускае выяўленчае мастацтва?**

— У Мінску я быў у майстэрні народнага мастака СССР Заіра Азгура. Ужо ў Кітаі пісаў пра яго. Мне давялося падрыхтаваць некалькі артыкулаў пра геніяльнага, на мой погляд, графіка, жывапісца Георгія Паплаўскага…

**— Не так даўно ён адзначаны прэміяй Саюзай дзяржавы Беларусі і Расіі…**

— Перадавайце Георгію Георгіевічу мае віншаванні. З захапленнем і сёння разглядваю яго ілюстрацыі да твораў беларускіх пісьменнікаў. Найперш — Васіля Быкава, Алеся Адамовіча.

Параўнальна нядаўна ў мяне ў гасцях быў беларускі паэт і публіцыст, чалавек з прыемным голасам Навум Гальпяровіч. Цяпер я ўжо ведаю, што ён многія гады працуе ў радыёжурналістыцы. Пазнаёміўся і з яго дачкой — маладой журналісткай Вольгай Гальпяровіч, якая прадстаўляе Беларусь у Кітаі. Дарэчы, у дадатак да партрэтаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, Святланы Алексіевіч, Васіля Быкава я намаляваў і партрэт Навума Гальпяровіча.




...а такім — Максіма Танка.

**— Нядаўна і вы адзначаны прэстыжнай узнагародай — прэміяй «Расія — Новае стагоддзе», усталяванай Расійскім культурным цэнтрам у Пекіне і Гуманітарным фондам Андрэя Скоча «Пакаленне»…**

— Так, я вельмі ўсцешаны такой высокай ацэнкай маёй працы. Пераклад «Рэквіема» Ганны Ахматавай — менавіта за гэта такая адзнака. І якраз гэты пераклад я лічу галоўнай працай свайго жыцця. Увогуле ў маім творчым сэрцы, проста ў маім сэрцы жывуць тры сонцы. Тры вялікія літаратуры мяне цікавілі і цікавяць цяпер — руская, украінская, беларуская. Вам, славянскім народам, ёсць чым ганарыцца. Як перакладчык я заўжды наталяў сваю смагу работай над пераўвасабленнем твораў Аляксандра Пушкіна на кітайскую мову. Мяне цікавіў Тарас Шаўчэнка. Я пераклаў яго паэму «Кацярына»… І як мастак я быў пад уражаннем постацяў Пушкіна, Льва Талстога, Фёдара Дастаеўскага, Уладзіміра Маякоўскага, Ганны Ахматавай, Тараса Шаўчэнкі… Пабываўшы ў розных гарадах Расіі, я замалёўваў помнікі, надмагіллі паэтаў, вялікіх пісьменнікаў. Мяне заўжды цікавіла атмасфера, якая складвалася ў славянскіх народаў па ўшанаванні творчых людзей, успрыняццю іх як асоб. Вось нядаўна атрымаў з Беларусі фотаздымкі магілы Максіма Танка, помніка, які ўсталяваны там, на Мядзельшчыне, у Мінскай вобласці. Можа, з часам гэтыя выявы падштурхнуць да маіх каліграфічных вышукаў?..

**— Будзем спадзявацца і мы на гэта. Дзякуй вам, дарагі Гао Ман, за ўвагу да беларускага прыгожага пісьменства! І добрага здароўя!**

**Максім ЛАДЫМЕРАЎ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 19.08.2014 в 10.00 по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.**

**Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск», находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.**

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

**1. Помещение №221, арендуемой площадью 23,3 кв.м, на втором этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, водо- и электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 594 150 рублей; размер задатка – 59 400 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.**

**2. Помещение №419, арендуемой площадью 21,7 кв.м, на четвертом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, водо- и электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 553 350 рублей; размер задатка – 55 300 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.**

**Документы на участие в аукционе принимаются с 19.07.2014 по 15.08.2014 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 15.08.2014, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

*- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефоны для справок: (8-017) 209-91-26, (8-017) 209-92-78.

## К публикации ГОМЕЛЬСКОГО ГОРОДСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле, который состоится 13 августа 2014 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 26.06.2014 г. ) добавляются лоты №№ 4–6 в следующей редакции:

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | в районе озера Любенское | 340100000006004882 | 0,0150 | для размещения лодочной станции и организации услуг проката водного транспорта (земельный участок для размещения объектов иного назначения) | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Ограничения в использовании - прибрежная полоса озера Любенское. | 1 | 2 376 500 | 475 200 | 1 901 560 |
| 5 | ул. Могилевская (район здания по ул. Могилевской, 5) | 340100000005006597 | 0,2081 | для размещения объекта производственного и складского назначения (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения) | | Ограничения в использовании – охранная зона линий электропередач – 0,0135 га. Условия: согласование проектно-сметной документации с городским узлом электросвязи, при необходимости предусмотреть вынос сетей связи; предусмотреть вынос кабельной линии. | 25 | 151 916 750 | 30 383 000 | 10 640 809 |
| 6 | микрорайон № 104 | 340100000007006405 | 0,2800 | для строительства здания специализированного общественного питания (земельный участок для размещения объектов общественного питания) | | Ограниченя в использовании в связи с расположением в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (сетей и сооружений канализации) площадью 0,0450 га | 50 | 424 870 550 | 84 974 100 | 11 327 232 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности горисполкома. Лоты №№ 4–6 выставляются повторно. Объявления опубликованы в газете «Звязда» 23.05.2014 г., 31.05.2014 г.

**Контактные телефоны: 77-69-35; 77-67-27; факс: 77-48-85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by**

Трастбанк

*«Банк, основанный на доверии»*

## ЗАО «Трастбанк»

220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

Закрытое акционерное общество «Трастбанк» Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2013 года

### ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

*(в миллионах белорусских рублей)*

| | Прим. | 31 декабря 2013 года | 31 декабря 2012 года (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **АКТИВЫ** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 4 | 138,842 | 179,906 |
| Обязательные резервы на счетах в Национальном банке Республики Беларусь | | 6,369 | 7,334 |
| Финансовые активы, оцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток | 5 | 98,710 | 98,874 |
| Кредиты и дебиторская задолженность | | 284,270 | 459,234 |
| *Средства в других банках* | *6* | *3,478* | *3,706* |
| *Кредиты клиентам* | *7* | *280,792* | *455,528* |
| Активы, имеющиеся в наличии для продажи | 8 | 2,927 | 843 |
| Основные средства | 9 | 100,634 | 101,465 |
| Нематериальные активы | 10 | 3,378 | 4,924 |
| Прочие активы | 11 | 64,670 | 10,104 |
| **Итого активы** | | **699,800** | **862,684** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Финансовые обязательства, оцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток | 5 | - | 1 |
| Финансовые обязательства, учитываемые по амортизированной стоимости | | 552,785 | 722,602 |
| *Средства других банков* | *12* | *37,918* | *80,182* |
| *Средства клиентов* | *13* | *382,237* | *461,471* |
| *Собственные выпущенные ценные бумаги* | *14* | *36,155* | *79,000* |
| *Обязательства по финансовому лизингу* | | *3,752* | *4,604* |
| *Субординированные займы* | *15* | *92,723* | *97,345* |
| Обязательство по текущему налогу на прибыль | | 8 | - |
| Обязательство по отложенному налогу | | 2,874 | 3,348 |
| Прочие обязательства | 17 | 3,120 | 7,074 |
| **Итого обязательства** | | **558,787** | **733,024** |
| **КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 18 | 407,461 | 392,331 |
| Непокрытый убыток | | (266,448) | (262,671) |
| **Итого капитал** | | **141,013** | **129,660** |
| **Итого обязательства и капитал** | | **699,800** | **862,684** |

### ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

*(в миллионах белорусских рублей)*

| | Прим. | Год, закончившийся 31 декабря 2013 | Год, закончившийся 31 декабря 2012 (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы | 19 | 89,955 | 109,601 |
| Процентные расходы | 19 | (53,193) | (78,950) |
| **Чистые процентные доходы** | | **36,762** | **30,651** |
| Комиссионные доходы | 20 | 18,462 | 15,733 |
| Комиссионные расходы | 20 | (4,275) | (4,483) |
| **Чистые комиссионные доходы** | | **14,187** | **11,250** |
| Чистый доход по операциям с финансовыми инструментами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прибыль или убыток | 21 | - | 7,387 |
| Чистый доход по операциям с иностранной валютой и драгоценными металлами | | 2,856 | 3,191 |
| Чистые доходы по активам, имеющимися в наличии для продажи | 22 | 957 | - |
| Прочие доходы | 23 | 14,792 | 19,629 |
| **Итого операционные доходы** | | **69,554** | **72,108** |
| Расходы на персонал | | (36,056) | (41,765) |
| Амортизация | | (4,104) | (10,957) |
| Административные расходы | 24 | (30,835) | (34,314) |
| Чистый убыток от обесценения кредитов клиентам | 7 | 5,834 | (6,675) |
| Чистый убыток от обесценения прочих активов | | (1,280) | (269) |
| **(Убыток)/прибыль до налогообложения и отражения убытка по чистой монетарной позиции** | | **3,113** | **(21,872)** |
| Расходы по налогам на прибыль | 16 | (24) | (2,409) |
| **Убыток до налогообложения и отражения убытка по чистой монетарной позиции** | | **3,089** | **(24,281)** |
| Убыток по чистой монетарной позиции | | (4,106) | (12,442) |
| **Чистый убыток за отчетный год** | | **(1,017)** | **(36,723)** |
| **Прочий совокупный доход/(расход)** | | **-** | **-** |
| **ИТОГО СОВОКУПНЫЙ УБЫТОК ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД** | | **(1,017)** | **(36,723)** |

### ПРИМЕЧАНИЯ К ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

*(в миллионах белорусских рублей)*

| | Уставный капитал | Непокрытый убыток | Итого капитал |
|---|---|---|---|
| **Остаток на 1 января 2012 года** | **299,617** | **(167,905)** | **131,712** |
| Эффект пересчета прошлых лет на гиперинфляцию | 49,436 | (27,705) | 21,731 |
| **Остаток на 1 января 2012 года (пересчитано)** | **349,053** | **(195,610)** | **153,443** |
| **Общий совокупный доход за период** | **-** | **(36,723)** | **(36,723)** |
| **Операции с собственниками, отражаемые напрямую в капитале** | **43,278** | **(30,338)** | **12,940** |
| Эмиссия акций | 12,940 | - | 12,940 |
| Капитализация нераспределенной прибыли | 30,338 | (30,338) | - |
| **Остаток на 31 декабря 2012 года (пересчитано)** | **392,331** | **(262,671)** | **129,660** |
| Чистая прибыль за год | - | (1,017) | (1,017) |
| **Операции с собственниками, отражаемые напрямую в капитале** | **15,130** | **(2,760)** | **12,370** |
| Эмиссия акций | 12,730 | | 12,370 |
| Перераспределение между статьями капитала | 2,760 | (2,760) | - |
| **Остаток на 31 декабря 2013 года** | **407,461** | **(266,448)** | **141,013** |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

*(в миллионах белорусских рублей)*

| | Прим. | 2013 | 2012 (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **Денежные потоки от операционной деятельности** | | | |
| Проценты полученные | | 99,848 | 116,085 |
| Проценты уплаченные | | (53,415) | (79,131) |
| Комиссии полученные | | 18,462 | 15,733 |
| Комиссии уплаченные | | (4,275) | (4,483) |
| Реализованный результат по операциям с финансовыми активами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прибыль или убыток | | 7,951 | 7,386 |
| Реализованный результат по операциям с иностранной валютой и драгоценными металлами | | 396 | 3,191 |
| Прочие операционные доходы | | 11,680 | 19,629 |
| Расходы на персонал уплаченные | | (36,056) | (41,765) |
| Уплаченные административные расходы | | (30,835) | (34,314) |
| | | **13,756** | **2,331** |
| *(Увеличение)/уменьшение операционных активов:* | | | |
| Обязательные резервы на счетах в Национальном банке Республики Беларусь | | 965 | (2,586) |
| Средства в других банках | | 228 | 18,770 |
| Кредиты клиентам | | 158,987 | 9,496 |
| Активы, имеющиеся в наличии для продажи | | (2,062) | 8,136 |
| Финансовые активы, оцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток | | 164 | - |
| Прочие активы | | (54,566) | (6,926) |
| Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств: | | | |
| Средства других банков | | (42,264) | 86,583 |
| Средства клиентов | | (79,233) | (295,945) |
| Прочие обязательства | | (3,954) | 7,223 |
| **Потоки денежных средств использованные в операционной деятельности до уплаты налога на прибыль** | | **(7,979)** | **(172,918)** |
| Уплаченный налог на прибыль | | (16) | (3,334) |
| **Чистый поток денежных средств использованных в операционной деятельности** | | **(7,995)** | **(176,252)** |
| **Денежные потоки от инвестиционной деятельности** | | | |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | 9,10 | (3,590) | (10,942) |
| Выручка от реализации основных средств | | 30 | 35 |
| **Чистый поток денежных средств использованных в инвестиционной деятельности** | | **(3,560)** | **(10,907)** |
| **Денежные потоки от финансовой деятельности** | | | |
| Эмиссия акций | | 12,370 | 12,940 |
| Получение субординированного займа | | (4,622) | - |
| (Погашение)/поступления от выпуска собственных ценных бумаг | | (42,845) | (62,411) |
| Выплаты по обязательствам финансового лизинга | | (852) | - |
| **Чистый поток денежных средств использованных в финансовой деятельности** | | **(35,949)** | **(49,471)** |
| **Чистое уменьшение денежных средств и их эквивалентов** | | **(47,504)** | **(236,630)** |
| Влияние изменений обменных курсов на движение денежных средств и их эквивалентов | | 7,670 | (322) |
| Влияние инфляции на денежные средства и их эквиваленты | | (1,230) | (27,331) |
| **Денежные средства и их эквиваленты на начало года** | **4** | **179,906** | **444,189** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец года** | **4** | **138,842** | **179,906** |

**От имени руководства Банка:**

**Саксон В.М.**
**Председатель Правления**

**Бродик Н.В.**
**Главный бухгалтер**

**Минск, 27 июня 2014 года**

**Финансовая отчетность в полном объеме размещена на сайте http://www.trustbank.by/about/financial-statements/year/2013/**

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 26.04.2013 г. НБ РБ

KPMG

ООО «КПМГ»
ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004, Минск, Беларусь

Телефон +375 (17) 306 08 03
Факс +375 (17) 306 08 12
Моб. + 375 29 104 75 15
Интернет www.kpmg.by

### ЗАКЛЮЧЕНИЕ НЕЗАВИСИМЫХ АУДИТОРОВ

**Акционерам Закрытого акционерного общества «Трастбанк»**

Мы провели аудит прилагаемой финансовой отчетности Закрытого акционерного общества «Трастбанк» (далее именуемого «Банк»), которая включает в себя отчет о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2013 года и соответствующие отчеты о совокупном доходе, движении денежных средств и изменениях в капитале за год, закончившийся на указанную дату, а также краткое изложение основных принципов учетной политики и прочие примечания.

*Ответственность руководства за подготовку финансовой отчетности*

Руководство Банка несет ответственность за составление и достоверное представление данной финансовой отчетности в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, и за систему внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для составления финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений вследствие мошенничества или ошибок.

*Ответственность аудиторов*

Наша обязанность состоит в выражении мнения о достоверности данной финансовой отчетности на основании проведенного нами аудита. Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита. Эти стандарты обязывают нас соответствовать этическим нормам, а также планировать и проводить аудит таким образом, чтобы получить разумную уверенность в том, что финансовая отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в финансовой отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в финансовой отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению финансовой отчетности Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банка, и оценку общего представления финансовой отчетности.

Мы считаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения аудиторского мнения.

*Мнение*

По нашему мнению, финансовая отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение Закрытого акционерного общества «Трастбанк» по состоянию на 31 декабря 2013 года, а также финансовые результаты его деятельности и движение денежных средств за год, закончившийся этой датой, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности.

*Поясняющий параграф*

Не делая оговорок, мы обращаем внимание на тот факт, что, как указано в Примечании 2, Банк не соблюдал некоторые требования к минимальному размеру нормативного капитала. Это условие, наряду с другими обстоятельствами, описанными в Примечании 2, свидетельствует о существовании существенной неопределенности, которая может вызвать значительные сомнения в способности Банка продолжать свою непрерывную деятельность.

Не делая оговорок, мы обращаем внимание на тот факт, что, как указано в Примечании 2, в 2012 и 2013 годах экономика Республики Беларусь была признана гиперинфляционной согласно Международному стандарту финансовой отчетности 29 «Финансовая отчетность в условиях гиперинфляции» (МСФО 29). Функциональной валютой Банка является белорусский рубль, и, соответственно, финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2013 года, включая сопоставимые данные за 2012 год, была скорректирована в соответствии с МСФО 29.

Ирина Верещагина
Партнер
КПМГ Беларусь
Минск
1 июля 2014 года

БЕЛАРУСБАНК

## ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 2 123 302 | 1 777 502 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 6 477 | 10 226 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 16 700 457 | 17 392 577 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5 044 369 | 4 724 322 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 17 393 967 | 16 246 682 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 126 563 195 | 96 101 075 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5 000 772 | 4 002 664 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 986 862 | 640 397 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3 906 927 | 3 103 002 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 517 | 300 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 746 389 | 537 572 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 178 473 234 | 144 536 319 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 3 889 990 | 3 640 297 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 27 553 178 | 17 724 982 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 112 180 802 | 92 051 048 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 11 045 341 | 8 468 097 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 878 | 10 227 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 1 170 534 | 975 106 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 155 840 723 | 122 869 757 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 16 687 553 | 16 187 553 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 1 205 945 | 1 051 804 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 1 635 089 | 1 766 370 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 3 103 924 | 2 660 835 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 22 632 511 | 21 666 562 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 178 473 234 | 144 536 319 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 9 968 374 | 9 117 864 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 8 355 026 | 6 971 383 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 613 348 | 2 146 481 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 197 028 | 887 671 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 538 882 | 265 001 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 658 146 | 622 670 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 1 187 | 984 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (3 050) | (1 502) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 17 134 | 197 538 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 455 294 | 125 457 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 143 387 | 205 160 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 535 840 | 179 605 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 2 236 897 | 1 719 431 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 339 883 | 273 106 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 557 732 | 1 073 536 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 108 458 | 147 585 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 449 274 | 925 951 |

**Председатель Правления** **С.П.Писарик**

**И.о. главного бухгалтера** **М.Н.Кулевская**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

В связи с поступлением заявления о признании безвестно отсутствующим СКИРУХИ Антона Викторовича, 10 июня 1978 года рождения, уроженца г. Волковыска Гродненской области, зарегистрированного по адресу: г. Волковыск, ул. Боричевского, д. 14, кв. 36, последнее известное местожительство которого — г. Слоним, ул. Космонавтов, д. 5, кв. 1, находящегося в розыске с апреля 2013 года, местонахождение которого до настоящего времени неизвестно, суд Волковысского района обращается с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, располагающим сведениями о Скирухе Антоне Викторовиче, сообщить их суду в течение двух месяцев с момента публикации объявления.

## ИНФОРМАЦИЯ о проведении открытого аукциона 2 лотами по продаже недвижимого имущества: ЗДАНИЕ СКЛАДА И ЗДАНИЕ АДМИНИСТРАТИВНО-ХОЗЯЙСТВЕННОЕ

| | |
|---|---|
| **Адрес объектов и их наименование:** | Здание склада (инв. № 645/С-6624), 520,6 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., Старые Дороги, ул. Колхозная, 33. Снижена первоначальная цена продажи имущества до 15%, что составляет – 250 920 000 (двести пятьдесят миллионов девятьсот двадцать тысяч) белорусских рублей (с учетом НДС 20%).<br>Здание административно-хозяйственное (инв. № 640/С-61959), 1447,8 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцк, ул. Транспортная, 1. Снижена первоначальная цена продажи имущества до 15%, что составляет – 2 971 890 360 (два миллиарда девятьсот семьдесят один миллион восемьсот девяносто тысяч триста шестьдесят) белорусских рублей (с учетом НДС 20%). |
| **Продавец:** | ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2» |
| **Порядок оплаты:** | Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и публикацией объявления в СМИ. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 30-ти банковских дней со дня проведения аукциона. |
| **Сумма задатка:** | 10% от начальной цены объекта (лота) с учетом (НДС) на р/с 3012216860010 в ОАО Бел АПБ, г. Слуцк, ул. Копыльская, 7, код 921, УНП 601070249, ОКПО 031217156014 Получатель: Филиал «Автобусный парк № 2» |
| **Организатор аукциона:** | ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2», 223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4 |
| **Документы, предоставляемые для участия в аукционе:** | Копия платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка в размере 10% от начальной цены объекта (лота) (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток 10% от начальной цены объекта согласно Условиям проведения аукциона с НДС.»)<br>Дополнительная информация о документах размещена на сайте **www.minoblavtotrans.by (раздел «Новости»)** |
| **Конечный срок и адрес приема заявок:** | **20.08.2014 г. до 16.00** Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4 Филиал «Автобусный парк № 2», тел. 8 017 954 50 85, факс: 8 017 954 64 77, тел. 8017 294 13 95 |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** | **21.08.2014 г. в 10.00** Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4 |

УНН 601070249

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

***Летась, у жніўні, «Звязда» надрукавала досыць вялікае інтэрв'ю з Аляксандрам Брытам пад шматабяцальнай назвай «Жыццё — падарожжа сярод вобразаў, сімвалаў і... спакус». Таму, калі пасля прачытання гэтага апавядання вы зацікавіцеся біяграфіяй аўтара, раім зазірнуць у звяздоўскі архіў. А калі, прачытаўшы апавяданне «Транзітны эпізод», вы, да таго ж, захочаце пазнаёміцца з іншымі творамі пісьменніка, паспрабуйце адшукаць яго дэбютную кнігу «Кіно», якая летась выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Хочацца спадзявацца, такія ахвотнікі з'явяцца, бо проза Аляксандра Брыта сапраўды цікавая, са сваім адметным стылем.***

***А конкурс газеты на лепшае апавяданне працягваецца! Свае творы можаце дасылаць як на звычайны, так і на электронны адрас «Звязды». Нагадваем, пераможцы атрымаюць дыпломы і грашовыя прэміі. Зрэшты, галоўнае, думаецца, усё ж у тым, што кожнаму свайму ўдзельніку, чые творы будуць надрукаваны на старонках нашага выдання, газета дае цудоўны шанц выйсці да шырокага чытача.***

**Алесь БАДАК.**

**Аляксандр БРЫТ**

Апавяданне

# Транзітны эпізод

ГЭТУЮ журналістку я сустрэў у зале чакання аднаго аэрапорта. Падцягнуўшы пад сябе і злёгку адставіўшы ўбок ногі, яна сядзела побач і чытала газету. Бакавым зрокам я зачапіў партрэт Вангі.

— І вы ўсяму гэтаму верыце? — усміхнуўся я, і яна здзіўлена ўскінула вочы.

— Што вы маеце на ўвазе?

— Прадказанні, тэлепатыя.

— А вы — не?

— Нават не ведаю...

У яе былі вочы з усходніх казак — раскосыя, міндаль у чорным аксаміце. Вочы — баксёрскія, уважлівыя, рухомыя як ртуць. Схопленыя на патыліцы цёмна-русыя валасы — пад чорнай бейсболкай з эмблемай лотаса. На шыі — рознакаляровыя шкляныя пацеркі з украпінамі аплаўленых камянёў (як асколкі метэарыта). Апранутая ў джынсы, світар буйной вязкі. На нагах чамусьці лыжныя чаравікі. Нібыта яна так спяшалася, што нацягнула на сябе першае, што трапілася.

— І вы ў жыцці не сустракалі нічога... Дзіўнага? Невытлумачальнага?

— Пастаянна сустракаю,— лагодна, але крыху насмешліва сказаў я і змяніў тон на гатычны.— Дзве вечныя спадарожніцы — Дзіўнае і Невытлумачальнае — прыходзяць да мяне днём і ноччу. У чорных плашчах. У белых капелюшах з высокім верхам...

— Перастаньце, я сур'ёзна.

— І я не жартую.

Яна пацiснула плячыма, задуменна правяла пальцамі па пацерках і адклала газету так паспешліва, нібыта пазбаўлялася ад доказаў.

— А ў мяне была адна гісторыя... Дзіўная гісторыя... Я тады працавала ў адной газеце...

Як я зразумеў з яе аповеду, журналісткай яна была толькі па факце. А па адукацыі — сацыёлагам.

У свой час папулярная газета шукала рэкламадаўцаў, і яе, як сацыёлага, узялі на выпрабавальны тэрмін. Меркавалі, што сацыёлаг можа справіцца з гэтай працай. Патрабаванні былі, на першы погляд, простыя: максімальна запоўніць газетныя плошчы рэкламай. О'кей. Яна падышла да пошуку рэкламы па-навуковаму творча. Ацэньвала патэнцыял кліентуры, яе мэтавыя перспектывы і там, дзе была неабходнасць, ішла ва-банк. Аўчынка была варта вырабу, а гулец умеў весці партыю. Рэкламныя стаўкі пайшлі ўгору, і яе заўважылі. Адкінулі інтрыгі зайздроснікаў, як лупіну кавуна, і ацанілі. Прызначылі галоўным рэдактарам...

Я паглядзеў на яе, і яна прыязна ўсміхнулася. Яе скуласты твар саракагадовай жанчыны пачырванеў і набыў адценне дзявочай сарамлівасці. Яна нагадвала школьніцу-вундэркінда, якая за пятнаццаць хвілін да ўрока прачытала заданне і цяпер выдавала яго лёгка і нязмушана. Праўда, вочы былі баксёрскія, рухомыя, уважлівыя. Яна раз-пораз папраўляла бейсболку. Незразумела навошта. Пэўна, па звычцы.

— Я тады з-за гэтай газеты ледзь з мужам не развялася,— працягвала яна.— Днём і ноччу круцілася ў рэдакцыі. Вісела на тэлефоне, як павук. Жыццё было звязанае з газетай — лягчэй было з'ясці ранішні кавалак хлеба, чым не падумаць пра яе. Хацела забараніць яму прыходзіць. Але ён быў занадта нязлосны, чулы і ўважлівы. Заўсёды казаў прыемныя словы. Рабіў кампліменты, якія супадалі з праўдай. І яшчэ ён прыносіў мне апельсіны...

— Апельсіны?

— Так.

— Навошта?

— Вы зноў спяшаецеся,— з мяккім дакорам пахітала яна галавой.— А між тым мой дзіўны наведвальнік неяк сказаў: «Не занадта спяшайцеся ў гэтым жыцці, таму што нашы душы не заўсёды паспяваюць за нашымі целамі...»

— Дзівак нейкі...

— Не перапыняйце, калі ласка.

Я замоўк.

— Дык вось, ён прыходзіў да мяне кожны тыдзень. І прыносіў апельсіны. «Энергія сонца, святло,— казаў ён,— нейтралізуюць чужую цёмную энергію». Шчыра кажучы, ён мяне пачынаў раздражняць. Я наогул — нервовая штучка. Занадта ўспрымальная...

Яна на секунду змоўкла, як быццам збіраючыся з думкамі. Агонь заскакаў у яе пашыраных зрэнках. Нібы шаман біў у бубен каля вогнішча.

— Так, ён пачаў мяне раздражняць... Быў такі транзітны эпізод... Але як толькі гэта здарылася, ён перастаў з'яўляцца. Але з'явіўся іншы дзівак.— Яна аблізнула сухія вусны.— Я памятаю, калі ён прыйшоў, быў пахмурны дзень. Мне было вельмі сумна. І ў рэдакцыі спраў як заўсёды па горла. Ён зайшоў і сказаў: «Усё залежыць толькі ад вас. Вы можаце яе выратаваць». Я зірнула на яго. Апрануты з іголачкі. Імпазантны мужчына ў росквіце гадоў. Прыемны пах парфумы. Дарагая вопратка, абутак. Здаецца, усё пры ім, а вось твару ў яго не было. Замест твару — маска жаху. Як быццам нейкая цяжкая сіла разрывала яго твар кручкамі з розных бакоў. Такі твар, разумееце?

Я палічыў за лепшае прамаўчаць.

— Ён дастаў нейкія паперы, паклаў іх на стол і паўтарыў: «Усё залежыць толькі ад вас. Вы можаце яе выратаваць». Я спачатку нічога не зразумела: у чым справа? Каго выратаваць? Ён паказаў мне нейкія даведкі, эпікрыз. «Вось, мая нявеста ў коме... Збіла машына...» Ён прасіў... не, ён умаляў апублікаваць яго тэкст у газеце. У яго была маніякальная думка, што, калі я гэта зраблю, яго нявеста выжыве. «Калі вы гэтага не зробіце — вы яе заб'яце. Гэта будзе на вашым сумленні!»

ЯНА папраўляла бейсболку і ўздыхнула.

— Тэкст яго быў поўнай бязглуздзіцай. Апублікаваць яго я не магла. Раней у падобных выпадках я спасылалася на рэдакцыйную палітыку. Але тут быў не той выпадак. Я не магла яму сказаць: «Ваша нявеста памрэ, таму што ваш тэкст не адпавядае рэдакцыйнай палітыцы!» Я не ведала, што рабіць. Ён прыходзіў кожны дзень. Ён праводзіў мяне дадому. Ён сустракаў мяне з дому. Ён стаў маім ценем. Усё гэта доўжылася месяц, а можа, і больш. Я жыла ў страшэнным напружанні. І вось калі мне зрабілася невыносна, з'явіўся той першы дзівак. Ведаеце, што ён мне сказаў?

Я зноў палічыў неабходным не рэагаваць на яе рытарычнае пытанне.

— Ён выслухаў маю гісторыю і параіў: «Спаліце ўсе яго паперы. І пастаўце свечку ў царкве яго нявесце за здароўе». Я так і зрабіла — і, дзіўная справа, больш той чалавек не з'яўляўся...— Яна памаўчала, дала зразумець, што расказ скончаны, а потым спытала: — Вось як вы думаеце, што гэта было, а?

Я стрымана пацiснуў плячыма.

— Супадзенне. Нічога дзіўнага.

— Супадзенне? — Яна ўсміхнулася аднымі вуснамі, зняла сваю чорную бейсболку і вызваліла цёмна-русыя, з рэдкім срэбрам сівізны, валасы. Яны хваляй абрынуліся на плечы і зрабілі яе вострыя скулы больш прывабнымі. Агонь зноў заскакаў у яе пашыраных зрэнках. І шаман забіў у бубен з падвоенай сілай. Ціха, але цвёрда яна прамовіла: — Вы носіце грошы ў правай кішэні. Вы карыстаецеся заціскам, а не партманетам.

Яна мела рацыю: я трымаў заціск для грошай у правай кішэні. Але я запярэчыў:

— Гэта выпадковасць. Вы адгадалі.

— Вось як?

— Цяпер шмат хто носіць заціскі.

— Гэта праўда,— пагадзілася яна і з бездакорнай дакладнасцю дадала: — Але ў вашым заціску, акрамя розных купюр,— усяго адна купюра ў сто долараў.

Не без прыкрасці я дастаў заціск, неахвотна прадэманстраваў ёй стадоларавую купюру, і засунуў яго ў кішэню.

— Вы і на гэты раз адгадалі. А можа, бачылі, калі я расплачваўся ў буфеце за каву... Але мне трэба ісці: хутка мой рэйс.

Я ўстаў, а яна засталася сядзець. Моўчкі разгарнула сваю газету і нешта хутка на ёй напісала. Затым вырвала газетны кавалак, склала яго ў канверцік, парвала і тут жа, як цыркачка, спрытна разгарнула гэты кавалак абсалютна цэлым.

— Гэта вам на памяць. Я там сёетое вам паведаміла.— Яна ўсміхнулася і, зноў згарнуўшы канверцік, засунула мне яго ў кішэню.— І вось газету вазьміце. Будзе вольны час — пачытаеце...

Я ўзяў з яе рук газету, падзякаваў і са змяшанымі пачуццямі хацеў ужо пайсці да выхаду.

— Віктар...— спыніла яна мяне.

Я ўважліва паглядзеў на яе.

— Адкуль вы ведаеце, як мяне завуць?

— Зараз я адгадала. У вас татуіроўка на левай руцэ — знак вікторыі...

Ужо ў самалёце, гартаючы газетныя палосы, я наткнуўся на інтэрв'ю нейкай незнаёмай журналісткі. Яе партрэт мне анічога не казаў. Але вочы мае выхапілі фразу: «Я жыла ў страшэнным напружанні. І вось калі мне зрабілася невыносна, з'явіўся той першы дзівак». Я зразумеў, што не больш чым паўгадзіны таму мне ўжо таленавіта пераказалі гэтую гісторыю.

«Вось сцерва! — вылаяўся я і засунуў руку ў правую кішэню. Замест заціску для грошай я намацаў маленечкі газетны канверцік. Я разгарнуў яго і ўбачыў выразныя вялікія літары: «Вы ўжо, напэўна, паспелі мяне аблаяць? Да...». Апошняе слова было разарвана. Я разгладзіў кавалак газеты, знайшоў месца, адкуль ён быў вырваны, і прачытаў яшчэ раз усю фразу: «Вы ўжо, напэўна, паспелі мяне аблаяць? Дарэмна: вашы грошы не ў правай, а ў левай кішэні».

Як зачараваны, я засунуў руку ў левую кішэню. Заціск для грошай быў на месцы.

**НАРОДЖАНЫЯ 19 ліпеня**

**Галоўная тэма ў іх жыцці — рух, грацыёзнасць, форма; вялікую ўвагу яны надаюць свайму целу. Многія з іх капрызныя і непастаянныя ў сваім настроі. Выключнай якасцю для іх з'яўляецца правільная самаацэнка — яны хутка і лёгка прызнаюць свае памылкі. Людзі гэтага дня — самакрытычныя асобы, якія часта прымаюць бяздзеянне за форму няўпэўненасці ў сабе і нерашучасці. У сувязі з гэтым ім вельмі карысна навучыцца цярпліва чакаць узнагароды за працу, што загартоўвае іх волю. Ім неабходна асцерагацца эмацыянальных расчараванняў, таму што яны бываюць вельмі ідэалістычнымі ў дачыненні да пачуццяў іншых людзей.**

**НАРОДЖАНЫЯ 20 ліпеня**

**Часта жыццё гэтых людзей складаецца з шэрагу ўзлётаў і падзенняў. Гэта адносіцца да сямейнай, прафесійнай і эмацыянальнай сфер жыцця, мар і захапленняў. Для іх важны не цяперашні стан, а будучае, не «ёсць», а «стаць». Блізкія чакаюць ад іх даверлівага партнёрства і надзейнасці, аднак ім неабходна назапасіць цярплівасці, таму што народжаным у гэты дзень патрабуецца шмат часу, каб дасягнуць сваёй мэты. Яны могуць адчуваць расчараванне і быць нешчаслівымі нават пасля дасягнення відавочнага поспеху. Ім неабходна развіваць у сабе пачуццё спакою; калі не хапае смеласці, здолець прызнацца ў гэтым і задаволіцца тым, што ўжо ёсць.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Пачатак тыдня можа зблытаць усе планы і задумы, але ўжо ў сярэдзіне наступіць праясненне. Хутчэй за ўсё, давядзецца цэлымі днямі разбірацца з праблемамі, якія назапасіліся. Галоўнае — не запускаць бягучых спраў, інакш да канца тыдня цяжар стане непад'ёмным. Больш увагі надайце родным, асабліва дзецям.

**ЦЯЛЕЦ.** Трымайце сябе ў руках: праяўленні азарту цяпер зусім недарэчы — як і крыўдлівасць і амбіцыйнасць. Празорлівасць і інтуіцыя дапамогуць вам пазбегнуць канфліктных сітуацый. Давядзецца некаторы час паводзіць сябе цішэй вады, ніжэй травы.

**БЛІЗНЯТЫ.** Прыток сіл дазволіць у літаральным сэнсе звярнуць горы. Ажыццявяцца нават самыя нязбыўныя мары. Галоўнае — не сумнявайцеся, бо ўсё залежыць ад вас. Убачыць плён сваёй працы зможаце крыху пазней.

**РАК.** Вы не проста павінны — будзеце вымушаны даводзіць да лагічнага завяршэння абсалютна ўсе справы, якія пачалі менавіта на гэтым тыдні. Будзеце ў добрым настроі, дзякуючы чаму ўсё намечанае будзе атрымлівацца з першага разу. У крайнім выпадку — з другога.

**ЛЕЎ.** Несвядома будзеце дражніць фартуну — і зусім дарэмна. Вельмі пажадана стрымлівацца і не каментаваць яхідна ўсё, што адбываецца. Гэту з'едлівасць запомняць надоўга, і ў патрэбны момант вы можаце аказацца без падтрымкі толькі таму, што мелі неасцярожнасць сказаць штосьці крыўднае.

**ДЗЕВА.** Тыдзень прымусіць дзейнічаць нават самых лянівых. Сітуацыя абяцае скласціся такім чынам, што ад сур'ёзных крокаў будзе ўжо ніяк не адкруціцца. У панядзелак і аўторак удалымі будуць дзелавыя сустрэчы. Ваша задача — зрабіць на партнёраў добрае ўражанне. У сярэдзіне тыдня верагодны клопатныя мерапрыемствы, якія звязаны з навядзеннем парадку ў справах.

**ШАЛІ.** Знізьце крыху тэмп работы і скараціце яе аб'ём: вам неабходны кароткачасовы перапынак. Рашэнні, ад якіх залежыць будучыня, прымайце самастойна. Не прыслухоўвайцеся да парад навакольных, бо ваша сітуацыя нестандартная. Калі прыкладзяце пэўныя намаганні, то перашкод у дасягненні жаданых вынікаў не ўзнікне.

**СКАРПІЁН.** У панядзелак ці аўторак з'явіцца магчымасць закласці падмурак для буйных пазітыўных перамен. У сераду кожнае ваша слова для навакольных будзе мець велізарнае значэнне. Прыміце ўдзел у распрацоўцы новага праекта: пачарпніце шмат цікавага і карыснага для сябе. Аднак старайцеся пазбягаць непатрэбных кантактаў.

**СТРАЛЕЦ.** Тыдзень можа адкрыць цудоўныя магчымасці. Рыхтуйцеся да барацьбы: ад намечанага не варта адступаць пры першай жа сустрэчы з перашкодамі. Такіх будзе дастаткова. У выпадку неабходнасці лепш не звяртацца па дапамогу да сяброў, а даручыць вырашэнне праблемы спецыялістам.

**КАЗЯРОГ.** Тое, што раней падавалася недаступным, цяпер можа вырашыцца з лёгкасцю. Многія праблемы знікнуць, а справы будуць ісці паспяхова, калі не праявіце залішняй прынцыповасці, падвяргаючы крытыцы калег. У другой палове тыдня з'явіцца магчымасць рэалізаваць свае жаданні і зрабіць адказныя крокі.

**ВАДАЛЕЙ.** Працы чакаецца многа, але ўменне планаваць час дазволіць выканаць усё ў тэрмін. На пачатку тыдня будзеце выношваць важныя планы, якія рэалізуюцца ў бліжэйшай будучыні. Вырашэнне спрэчнага пытання, якое ўзнікне ў панядзелак, лепш адкласці да пачатку наступнага тыдня. Не спадзявайцеся на парады сяброў: яны могуць збіць вас з толку. Аптымізм і ўпэўненасць у сабе зробяць для вас тое, чаго вы не дабіліся б ніякімі хітрыкамі.

**РЫБЫ.** Проста неабходна праявіць актыўнасць — гэта дазволіць рэалізаваць планы і ідэі, якія даўно выношваліся. Не забывайцеся разбірацца з бягучымі праблемамі. Звярніцеся па параду да калег — і яны перастануць успрымаць вас з раздражненнем. Гэты манеўр умацуе ваш аўтарытэт. Верагодны новыя кантакты, якія паспрыяюць пашырэнню дзелавых магчымасцяў.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ПАКАШТУЙЦЕ!

## Катлеты з печанага баклажана

***Спатрэбіцца:*** *баклажан (сярэдняга памеру) — 2 шт., цыбуля рэпчатая — 2 шт., часнок — 2 зуб., арэхі грэцкія (або фундук) — 50 г, мука грэцкая — 50 г, пятрушка, соль, перац чорны, алей (для смажання), сухары паніровачныя.*

Баклажаны неабходна запячы ў разагрэтай да 180 градусаў духоўцы да гатоўнасці, прыкладна 20–25 хвілін. Ачысціць іх ад лупіны, нарэзаць нажом, каб атрымалася грубае пюрэ. Цыбулю ачысціць, дробна нарэзаць і абсмажыць да залацістага колеру.

Здрабніць арэхі, часнок і лісцікі пятрушкі. Грэчку здрабніць у кавамолцы да стану мукі. У місцы змяшаць пюрэ з баклажана, арэхавую сумесь і грэцкую муку. Добра змяшаць, пасаліць, паперчыць.

Сфармаваць маленькія катлеткі. Абсмажыць на разагрэтай з алеем патэльні да гатоўнасці.

Падаваць са смятанай або любым іншым любімым соусам!



## Кабачкі а-ля ананасы

***Спатрэбіцца:*** *кабачкі — 2 шт. Для расолу на 1 л вады: цукар — 150 г, лімонная кіслата — 1 ч.л. без горкі, дробка куркумы (або індыйскі шафран). Можна яшчэ дадаць араматызатар «ананас».*

Ачысціце кабачкі ад скуркі. Нарэжце іх кружочкамі таўшчынёй 1–1,5 см, затым акуратна нажом або чаркай (у залежнасці ад таўшчыні кабачка) выдаліце сярэдзінку. У нас атрымаюцца кольцы кабачкоў. Наліце ваду ў каструлю, дадайце цукар і лімонную кіслату. Размяшайце, дадайце куркуму і пастаўце на агонь. Калі вада закіпіць, апусціце туды кабачкі на 3–5 хвілін. Пакіньце астываць пры пакаёвай тэмпературы ў марынадзе. Затым кабачкі перакладзіце ў слоік, заліце марынадам і пастаўце ў халадзільнік на 1 гадзіну.



### САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

## Ідэальны колер валасоў

**Ад колеру валасоў вельмі залежыць наша прывабнасць. Аказваецца, няправільна падабранае адценне фарбы можа падкрэсліць бледнасць скуры і пачырваненні на ёй, робіць больш прыкметнымі цёмныя кругі пад вачыма і нават дадае дзясятак гадоў.**



Каб правільна выбраць свой колер валасоў, трэба адштурхоўвацца ад таго, да якога колератыпу вы адносіцеся.

**1. Вясна** — цёплы светлы тыпаж. Вы адносіцеся да яго, калі ваша скура гладкая і лёгка загарае, калі вы натуральная бландзінка ці ў вас русы колер валасоў і пры гэтым у вас светлыя вочы (шэрыя або шэра-блакітныя). У гэтым выпадку вам падыдзе блонд. Пры гэтым блонд можа быць насычаным, нават белым, але з абавязковым цёплым пшанічным адценнем. Таксама гэтаму тыпажу падыходзяць далікатныя адценні рыжага, блізкія да натуральнага, і адценні мёду.

**2. Лета** — халодны светлы тыпаж. Гэта асобы са скурай, якая даволі лёгка загарае, а вочы пры гэтым светла-карыя, шэрыя або сінія. Валасы звычайна ад русых да каштанавых. Гэтаму тыпажу падыдуць халодныя колеры: халодныя адценні русага, нават блізкія да попельнага, медныя і чырванавата-каштанавыя. Колер залежыць ад яркасці колеру вачэй. Калі вочы светлыя, то выбірайце больш лёгкія тоны. Калі вочы цёмнага насычанага колеру — бярыце каштанавы.

**3. Восень** — цёплы насычаны тыпаж. Гэта асобы з насычаным цёплым колерам скуры, часам трохі смуглявым. Вочы могуць быць зялёныя, цёмна-шэрыя ці карыя, а валасы — ад каштанавых да рудых. Такому колератыпу падыдуць цёплыя рыжаватыя адценні.

**4. Зіма** — насычаны халодны тыпаж. Гэта эфектныя брунеткі са светлай скурай і яркім колерам вачэй. Вочы — светлыя або цёмныя. Але пры гэтым галоўнае — наяўнасць кантрасту паміж колерам скуры і колерам валасоў. Гэты тып можа быць як больш цёплым, так і больш халодным. Гэтаму колератыпу падыдуць практычна ўсе насычаныя тоны. Асобы такога тыпу могуць эксперыментаваць з яркімі колерамі (махагон, рубін, чырвона-рыжы, адценні каштанавага), выбіраючы адпаведна халодныя (халодная зіма) або цёплыя тоны (цёплая зіма). Таксама такія дзяўчаты могуць эксперыментаваць з блондам (такія колеры не рэкамендуюцца, калі на твары шмат маршчын). Падыдуць попельныя адценні і адценне сівізны.

# СЁННЯ

## Сонца

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.02 | 21.29 | 16.27 |
| Віцебск | 4.45 | 21.25 | 16.40 |
| Магілёў | 4.52 | 21.19 | 16.27 |
| Гомель | 4.57 | 21.07 | 16.10 |
| Гродна | 5.19 | 21.43 | 16.24 |
| Брэст | 5.28 | 21.35 | 16.07 |

## Месяц

***Апошняя квадра ў 5.08.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

## Імяніны

***Пр.*** *Ульяны, Антона, Валянціна, Васіля, Інакенція, Фёдара.*
***К.*** *Макрыны, Вінцэнта, Марціна.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| Горад | Тэмпература |
|---|---|
| ВАРШАВА | +23..+25°С |
| ВІЛЬНЮС | +19..+21°С |
| КІЕЎ | +25..+27°С |
| МАСКВА | +25..+27°С |
| РЫГА | +20..+22°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +22..+24°С |

## УСМІХНЕМСЯ

СМС ад жонкі:

«Забяры дзіця з вуліцы, выкупай, накармі і пакладзі спаць».

Адказ мужа:

«Я чацвярых адмыў, пакуль нашага знайшоў».

**Самая смачная ежа — гэта астыўшая смажаная бульба. Ноччу, з патэльні, рукамі. Пакуль ніхто не бачыць!**

— Нашым футбалістам патрэбны чыгунны мяч.

— Яны ж ногі сабе пераламаюць!

— Дык яны ў іх што, цэлыя?

**Жонка навяла сёння парадак у сваёй сумачцы. Колькі ўсяго ўсялякага там было... Два разы смеццевае вядро выносіў!**



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь**

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.582. Індэкс 63850. Зак. № 2935.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 ліпеня 2014 года.